Купалле ў Ляневе і Залуках ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Будзе большы парк? ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2773) Год LIV | Беласток, 5 ліпеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Канец ціхіх дзён?

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Каля сотні прадпрыемстваў з абедзвюх краін прыняло ўдзел у I Польска-Беларускім эканамічным саміце ў Варшаве. Усё паказвае на тое, што адбыўся пералом у двухбаковых стасунках, асабліва гаспадарчых.

— Разлічваю на тое, што наступіць канец нашых ціхіх дзён, — сказаў спецыяльны госць саміту прэм'ер Дональд Туск.

Беларускія і польскія прадпрымальнікі ды прадстаўнікі міністэрстваў два дні (23 і 24 чэрвеня) у адной з эксклюзіўных варшаўскіх гасцініц дыскутавалі ў рабочых групах над праблемамі энергетыкі, фінансаў і страховак, гандлю і сельскай гаспадаркі ды рэгіянальнага супрацоўніцтва і турызму.

Саміт праводзіўся пры ўдзеле віцэ-прэм'ераў абедзвюх краін: Андрэя Кабякова і Вальдэмара Паўляка. Польскі віцэ-прэм'ер і заадно міністр эканомікі пераконваў:

— Гэты першы Гаспадарчы саміт Польшча — Беларусь паказвае, што праграма „Усходняга партнёрства", ініцыятарам якой з'яўляецца прэм'ер Дональд Туск, можа быць напоўнена фактамі. Дасягнуты вынік у нашых гандлёвых абаротах, які налічвае больш за 3 мільярды долараў, з'яўляецца рэкордным на працягу апошніх гадоў.

Віцэ-прэм'ер Паўляк адзначыў таксама значэнне перагавораў па справах м.інш. энергетыкі і транзіту нафты ды працэсу прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў (што ў час саміту сказаў „Ніве" віцэ-прэм'ер Паўляк — чытайце на 2 стар.)

Віцэ-прэм'ер Кабякоў у сваю чаргу запрапанаваў чарговае падобнае спатканне ў будучым годзе, на гэты раз на тэрыторыі Беларусі:

— З 2002 г. нашы гандлёвыя абароты павялічыліся ў пяць разоў. Няшмат краін можа пахваліцца такім абаротам.

Адзначыў, што ў гаспадарчай палітыцы Беларусі ў апошні час вырашана аб лібералізацыі эканомікі, між іншым, прыватызацыі прадпрыемстваў пры захаванні гаспадарчага патэнцыялу дзяржавы, аб развіцці сферы паслуг і прынцыпі пад увагу захоўнай, сацыяльнай дзяржаўнай палітыкі. Віцэ-прэм'ер Беларусі разлічвае на тое, што Польшча стане ў ЕС заступніцай Беларусі, калі гаворка м.інш. пра інвестыцыйныя палёгкі для гэтай краіны.

Паінфармаваў таксама аб дасягненні дагавору аб сумеснай рэалізацыі праекта па пабудове электраперадатачных ліній Рось — Нарва:

— Гэты праект можа быць цікавым для нашых партнёраў не толькі з Польшчы і Беларусі.

Злева: беларускі віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў і прэм'ер Польшчы Доналд Туск

З беларускім віцэ-прэм'ерам каля паўгадзіны за зачыненымі дзвярыма размаўляў прэм'ер Дональд Туск. Раней звярнуўся ён да ўдзельнікаў саміту, выказваючы радасць, як гэта назваў, ад факту, што ўрэшце даходзіць да парвання з палітыкай „узаемнага сумнага маўчання".

— На шчасце, вялікую частку адказнасці за адносіны паміж народамі бяруць на сябе людзі з-па-за палітыкі: прадпрымальнікі, артысты, турысты... Каб даць ім шанц на гаспадарчы, мастацкі абмен, але таксама і той, які датычыць г.зв. пазітыўных эмоцый, трэба, каб палітыкі ў сваіх дзеяннях завельмі гэтым людзям не перашкаджалі. Паляпшэнне стасункаў з Беларуссю шляхам прымяняння пазітыўных інструментаў ад першых дзён маёй працы з'яўляецца для мяне прыярытэтам.

Дадаў:

— Нельга нам марнаваць час, паддавацца адмоўным эмоцыям. Час крызісу, парадаксальна, можа стаць такім каталізатарам не толькі гаспадарчага абмену. Я ўспрымаю гэтае спатканне таксама ў палітычным маштабе, як знак добрай волі.

На канец заявіў:

— Я зраблю ўсё, каб гэты крок не быў апошнім крокам у гэтым — спадзяюся — хуткім працэсе збліжэння. Ведаю сужонствы, у якіх ціхія дні працягваліся задоўга і канчаліся расстаннем. Нашмат лепшая мадэль, гарантуючая пастаяннае сяброўства і пастаяннае зразуменне, гэта мадэль, у якой абавязвае шчырасць. З пункту гледжання майго ўрада, з пункту гледжання палякаў, не мяняюцца погляды датычныя сітуацыі нашай меншасці ў Беларусі, захоўвання іхніх правоў і ўсіх стандартаў, якія ў Еўропе лічым неабходнымі ў парламенцкай дэмакратыі, такіх як ушанаванне правоў чалавека і грамадзяніна. Гавару аб гэтым шчыра якраз таму, што разлічваю на тое, што шчырасць і адкрытасць будзе дамінаваць у нашых адносінах.

У час кароткай прэс-канферэнцыі пасля сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Кабяковым, Дональд Туск, у якога „Ніва" спыталася пра перашкоды ў падпісанні дамовы аб малым памежным руху з Беларуссю, заявіў:

— Гэта пытанне не перашкод, а працэдур, якія ў такіх выпадках займаюць шмат часу. Яшчэ да сённяшняй сустрэчы я даведваўся, у якой перспектыве часу можна разлічваць на фінал у гэтай справе, і мяркую, што на працягу двух месяцаў усе працэдуры будуць завершаны.

Неафіцыйна, усё ж, як мы даведаліся, канчаткова гэтая дамова, пасля заключэння над ёю пагадненняў на працягу гэтых двух месяцаў, праўдападобна ўвойдзе ў сілу, аднак, пры канцы гэтага года.

Падагульваючы абрады саміту, ягоныя ўдзельнікі звярнулі ўвагу на неабходнасць вырашэння шматлікіх пытанняў, якія маглі палегчыць і ажывіць узаемныя гаспадарчыя адносіны. І вось было ўспомнена аб патрэбе супольнага польска-беларускага мытнага кантролю грузавых машын ці павелічэння ліміту паліва для такіх машын, уязджаючых у Польшчу з Беларусі (у апошні час ён павялічаны з 300 да 600 літраў паліва). Юзаф Лахоўскі, старшыня Польска-беларускай гандлёва-гаспадарчай палаты:

— Трэба задумацца над тым, як стварыць „зялёныя лініі" для нашых фірм па абодвух баках мяжы, каб іхні транспарт не чакаў у чэргах на мяжы, што цягнуцца кіламетрамі.

У размове з „Нівай" Васіль Раманаў, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты прызнаўся:

— Наш гандлёвы абмен адносна дынамічны, ды патэнцыял абедзвюх дзяржаў значна большы. Я лічу, што ў перспектыве гандлёвы абарот паміж нашымі краінамі мог бы дасягнуць 5-6 мільярдаў долараў.

На другі дзень саміту з удзелам віцэ-прэм'ераў Кабякова і Паўляка ў Варшаве была адкрыта Нацыянальная выстава Беларусі *(глядзі стар. 12)*.

Звычайныя дарогі ☞ 4
Аляксей МАРОЗ

Дзень Яцка ☞ 5
Ілона КАРПЮК

Памяць пра Тарасевіча ☞ 9
Ганна КАНДРАЦЮК

Беларусы з Гданьска ☞ 10
Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Каліноўскаму... ☞ 11
Анатоль ПАРЭМБСКІ

Выстава... ☞ 12
Мацей ХАЛАДОЎСКІ

9 770546 196000

З двухмоўем будзем мацнейшымі!

З Янкам ЦЕЛУШЭЦКІМ (справа) і Славамірам КУЛЕШАМ, раднымі Нараўчанскай гміны, якія выступілі з ідэяй двухмоўя ў гміннай адміністрацыі, гутарыць рэдакцыя „Павуціння”.

— Чаму беларуская мова патрэбная ў Вашай гміне?

— Такі закон быў патрэбны, таму што людзі размаўляюць па-беларуску ў крамах, у лекара, у гміне. Але калі мова не мае статусу дзяржаўнай, чалавек не адчувае сябе бяспечным. У такой сітуацыі кожны можа загадаць вам карыстацца польскай. Закон аб двухмоўі дае нам пачуццё бяспечнасці.

— Як увядзенне гэтага закону выглядала ў іншых меншасцей?

— Такі закон быў уведзены ў гмінах, дзе жыве нямецкая меншасць, прытым немцы ўвялі яго без ніякіх агаворак. У нашай гміне дайшло да абсурдных сітуацый, калі супраць нам выступілі свае людзі. Каб было смяшней, іх клуб завецца Беларускі народны камітэт. Таму нам нязручна раўняцца з іншымі меншасцямі.

— На якім зараз этапе рэалізацыі ў гміне Нараўка закон аб двухмоўі?

— Закон аб двухмоўі пакуль падпісаны войтам і занесены ў парадак дня працы Рады гміны. Пакуль што ўсё ідзе як трэба, так як мы планавалі. Спадзяюся, што ў будучыні прагаласуем за права на двухмоўныя ўказальнікі і гэта здзейсніцца яшчэ ў гэтым скліканні.

— Скажыце, чаму беларусы выступалі супраць сваёй роднай мовы?

— Не ведаем чаму людзі не хочуць жыць пад аховай належных нам законаў. Напэўна вялікую ролю адыгрывае страх. Бо калі глянуць на практычны бок закону, то ад яго адны карысці. У першую чаргу ён будзе спрыяць развіццю гміны. Здаецца, што людзі зусім несвядомыя, што закон дае пачуццё стабільнасці і бяспечнасці. У нашай гміне вялікую ролю іграюць адмоўныя эмоцыі. Хтосьці прагаласаваў на „не”, бо не любіць якогасьці паасобнага раднага...

— Скажыце, якія будуць карысці ад двухмоўных указальнікаў?

— Гэта паспрыяе развіццю турызму, асабліва агратурызму ў гміне. Людзі, якія прыязджаюць з іншых рэгіёнаў, хочуць пасмакаваць нашу беларускую адметнасць.

У нашых руках яшчэ і той козыр, што кошты ўстанаўлення двухмоўных указальнікаў поўнасцю фінансуе дзяржава.

— Нам здаецца, што мала хто з жыхароў нашых гмін напіша ў адміністрацыю прашэнне па-беларуску. Па простай прычыне, толькі нямногія беларусы добра ведаюць літаратурную беларускую мову. Як гэтая праблема выглядае ў Вашай гміне?

— Гэта праўда. Узровень ведання літаратурнай мовы ёсць такі, а не іншы. Але з законам мы мацнейшыя. Мы ўжо маем свядомасць, што такі ліст можна напісаць на беларускай мове!

— Усе паўтараюць, што закон аб двухмоўі робіцца з думкай пра будучае пакаленне, значыць, для нас, моладзі і дзяцей. Ці нехта з маладых людзей з Ляўкова, Семяноўкі, Нараўкі, Скупава пацікавіўся гэтай праблемай? Ці Вы сустракаліся з моладдзю ў школе, вясковых святліцах, каб пагутарыць пра іх будучыню з беларускімі назвамі?

— На жаль, не. Вы першыя маладыя людзі, якія захацелі пагутарыць з намі пра двухмоўе ў нашай гміне.

***„Павуціння”**, гутарку пад кірункам **Міхася Сцепанюка** падрыхтавалі Лукаш Зіневіч, Магдалена Панасюк, Куба Мэтэнька, Уля Ліпато, Аля Сіманюк, Юстына Тамашук-Спірыдовіч, Оля Міранюк, Аня Ярымовіч. Інтэрв'ю запісалі і апрацавалі **Магдалена Панасюк** (Белгімназія ў Гайнаўцы), **Якуб Мэтэнька** (Белгімназія ў Бельску-Падляшскім) **Аня Ярымовіч** (Гімназія ў Дубічах-Царкоўных), **Ганна Кандрацюк-Свярубская**.*

На мяжы з Беларуссю

На тэрыторыі Чаромхаўскай гміны ў пачатках трансфармацыі былі адкрыты два пагранпераходы: летам 1992 года чыгуначны Чаромха — Высока-Літоўск і год пазней, у снежні 1993 года — дарожны Полаўцы — Пяшчатка. Гэта паспрыяла турыстычнаму і эканамічнаму абмену паміж Польшай і Беларуссю. Было ўстаноўлена прамое чыгуначнае спалучэнне Беласток — Брэст (у раскладзе былі запісаны два цягнікі, але курсіраваў толькі адзін). Чыгунка не наракала на адсутнасць кліентаў. Штодзень падарожнічала некалькі соцень пасажыраў, квітнеў прыгранічны гандаль. Рынкі Беласточчыны былі забіты купцамі з-за ўсходняй мяжы, у якіх палякі абяспечваліся таварамі. Вядома, выгадна гэта было грамадскасці памежнай зоны (цэны ў „рускіх” былі меншыя), але цярпелі на гэтым айчынныя гандаль і вытворчасць. Паколькі пераходы не карысталіся статусам „міжнародных”, рух тут быў адносна меншы. Але за дзесяць гадоў пераходам Полаўцы — Пяшчатка, напрыклад, пакарысталася дзесяць з паловай мільёна чалавек. Адно ў першай палове 2003 года гэты лік склаў 308 тысяч. У асноўным дарожным пераходам карысталіся беларускія грамадзяне, паколькі пасля ўвядзення візавага рэжыму беларускі бок абмяжоваўся да выдачы кароткатэрміновых віз. Ды і па ацэнцы палякаў цэны віз былі надта высокімі. Жыхары пагранічнай зоны спадзяваліся ільгот (гаварылася, што для пражываючых у радыусе 50 км ад мяжы адменяць візы), але польска-беларускія міжурадавыя перагаворы зацягнуліся.

У снежні 2007 г. Польшча прыступіла да Шэнгенскага пагаднення. Гэта нашым грамадзянам дазволіла свабодна падарожнічаць па Еўропе. Паколькі еўрасаюзная мяжа перасунулася на ўсход, тады абвострыўся закон аб ахове граніцы, што паўплывала на прытармажэнне трансгранічнага турыстычнага абмену з Беларуссю. Перш за ўсё адменены быў супольны пашпартна-мытны кантроль на дарожным пераходзе Полаўцы — Пяшчатка. Дагэтуль праходзіў ён на беларускім баку, цяпер ён раздзелены: на польскім баку праходзіць ў Полаўцах, на беларускім — у Пяшчатцы. У выніку мадэрнізацыі пагранперахода ў Полаўцах на граніцы былі ліквідаваны гандлёвыя пункты продажу і канторы абмену валюты. Іхнія памяшканні сталі службовымі канторамі пагранічнікаў і мытнікаў. Працу страціла каля сарака асоб. У вёсцы Чаромсе ўпала, напрыклад, мясная крама фірмы „Курчак”, якая працавала кругласутачна з думкай аб пакупніках з-за ўсходняй мяжы.

А што дзеецца на чаромхаўскіх пагранпераходах зараз?

Ад 1 студзеня да 30 красавіка г.г. чыгуначным пераходам Чаромха — Высока-Літоўск пакарысталася на ўездзе 929 палякаў і 925 іншаземцаў, у адваротным напрамку — адпаведна — 873

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

і 601, а на дарожным пераходзе Полаўцы — Пяшчатка: на ўездзе — 9 554 палякаў і 143 289 іншаземцаў, а ў адваротным напрамку адпаведна — 9 705 і 16 230. Граніцу ў Полаўцах на ўездзе перасякло 8 875 аўтамабіляў на польскіх рэгістрацыйных нумарах і 8 712 на іншаземных, а на выездзе — адпаведна — 8 947 і 9 933.

У гэтым жа перыядзе мяжу ў Кузніцы-Беластоцкай перасякло 774 543 асоб, а ў Баброўніках 251 477 (у аналагічным перыядзе мінулага года адпаведна 496 217 і 212 199). Як паказвае статыстыка, далучэнне Польшы да Шэнгенскай зоны адно часткова паўплывала на прытармажэнне трансгранічнага абмену з Беларуссю і гэта ў першых пяці месяцах па прычыне паніжанага курсу нашай валюты, бо сёлетнія даныя паказваюць, што рух у пагранічнай зоне павышаецца нягледзячы на фінансавы крызіс. Гэта і я прыкмеціў, калі на пачатку чэрвеня размаўляў з функцыянерамі польскіх пагранічных служб у Полаўцах. Аўтамабільны рух як польскіх машын, так і з замежнымі рэгістрацыйнымі знакамі адбываецца там стабільна ў абодва бакі.

Уладзімір СІДАРУК

Вачыма еўрапейца

Новы імпульс

Першы Польска-Беларускі эканамічны саміт і трэцяя Нацыянальная выстаўка Беларусі, якія праводзіліся ў польскай сталіцы, былі, несумненна, новым імпульсам у польска-беларускіх адносінах. Дарэчы, так успрынялі яе і віцэ-прэм'еры Беларусі і Польшчы: Андрэй Кабякоў і Вальдэмар Паўляк. Такое меркаванне выказаў таксама прысутны на саміце Дональд Туск, як і раней ягоны беларускі калега Сяргей Сідорскі, які сустрэўся з віцэ-прэм'ерам Паўлякам у лютым у Мінску.

Яшчэ да чэрвеньскага саміту і выстаўкі прэм'ер Сідорскі ў адным з інтэрв'ю заявіў між іншым:

— Я хацеў бы яшчэ раз адзначыць наша зацікаўленне больш актыўным уключэннем Беларусі ў рэалізацыю праектаў і праграм у рамках агульнаеўрапейскай энергетычнай сістэмы.

Энергетычныя пытанні краналіся на саміце, былі таксама бачны на выстаўцы прапаноў, звязаных з гэтай галіной. У час саміту я ад імя „Нівы” размаўляў аб іх з віцэ-прэм'ерам Паўлякам:

— Ёсць праекты, якія ў рамках еўрапейскай праграмы развіцця трансгранічнай інфраструктуры заслугоўваюць увагі і несумненна маюць шанц на рэалізацыю, калі ў гэтым абсягу інвестары будуць спраўней прадстаўляць праекты. Праекты датычныя перасыльных мастоў электраэнергіі на Літву, Беларусь і Украіну маюць вялікі шанц на поспех.

Я распытваўся таксама пра тое, якое пытанне з'яўляецца цяпер найважнейшым у эканамічных адносінах з Беларуссю.

— Цяпер найважнейшым фактарам у адносінах з Беларуссю, пра які не ўпамінаецца, з'яўляюцца валютныя курсы. Злоты паслабеў на каля 40% і нашы тавары адносна патаннелі, затое беларуская валюта напачатку года дэвальвавалася на 20% і гэта не кампенсавала розніц у курсах. Другая справа — вялікамаштабныя інвестыцыйныя праекты. Важным з'яўляецца погляд на звышрэгіянальныя праекты, а не толькі на рэалізаваныя выключна ў нашых краінах, такія як Ямал-2, ці магчымасць працягу газаправода „Дружба” да Паўночнага мора. Гэта можа быць прыклад будавання добрых стасункаў Польшчы і Беларусі таксама ў адносінах да Расіі і Еўрасаюза.

Я папрасіў яшчэ, каб віцэ-прэм'ер польскага ўрада выказаўся на тэму працэсу беларускай прыватызацыі (да канца 2010 г. мае быць там прыватызаваных каля 500 прадпрыемстваў):

— Для нас важнае, каб шляхам падтрымкі польскіх прадпрыемстваў маглі і мы ў гэтым удзельнічаць. Важна, каб польскія прадпрыемствы інвеставалі ў Беларусі.

Заахвочваючы да супрацоўніцтва, беларускія бізнесоўцы і палітыкі адзначалі перш за ўсё факт лібералізавання ад нейкага часу беларускай гаспадаркі. Апрача прыватызацыі між іншым будуць уведзены змены ў сістэму надзелу зямлі пад інвестыцыі, быў прыняты ўказ, які рэгулюе дзейнасць свадобных эканамічных зон у малых гарадах (палёгкі ў гарадах да 50 тысяч жыхароў), спрошчаны быў працэс назначання ліцэнзій і рэгістрацыі фірм, ад новага года мае быць уведзены дванаццаціпрацэнтны лінейны падатак ад заробкаў. Як мне здавалася ў час саміту і выстаўкі, таксама па гэтых прычынах зацікаўленне польскіх прадпрымальнікаў Беларуссю ўзрастае, а палітычныя дэкларацыі на саміце (не толькі ў гаспадарчым маштабе) асабіста прэм'ера Туска, несумненна, прыслужацца гандлёва-эканамічным польска-беларускім адносінам, таксама і міжлюдскім.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Славім мы сваю зямлю ў купальскія ночы

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У канцы чэрвеня што ні ўік-энд, то беларускі фэст, гулянне аж да рання. Да купальскіх фэстаў рыхтуецца найчасцей уся гміна, а праводзяцца яны ў найбольш маляўнічых ды актыўных мясцінах, для якіх такое свята гэта нагода да прамоцыі роднай старонкі ды сабрання сваякоў не толькі з ваколіцы. А на самыя славутыя, дзе можна сустрэцца з найлепшымі выканаўцамі любімых песень ды дзе ёсць пачостка і для цела, з'язджаюцца госці нават з суседніх паветаў.

У суботні такі вечар, 27 чэрвеня, гуляла ўся Чыжоўская міна. Над рэчкай Локніцай, якая тут хутчэй Локнічка, ды разлітай у маляўнічае азерца, пра якую нядаўна гучна было ў сувязі з трагедыяй, якая разыгралася ля яе берага (гараць тут у памяць загінуўшых сялян знічы) на поплаве пачалося Купалле, якое не назавеш інакш як беларускім. Вяла яго спраўна па-беларуску тутэйшая прыгожуня, гучала наўкола родная мова, а са сцэны плылі свойскія песні. Прыйшлі сюды госці з суседніх вёсак, прыехалі госці з усяго Гайнаўскага павета, а нават з далейшых мясцін. Аляксандр Парфянюк з Кленік ды Мікалай Грыгарук з Ляшчын маюць адны пахвалы для свайго войта інжынера Юрыя Васілюка ды ўсяе Чыжоўскае гміны. Зямля тут добрая, жыць можна. А вось якія сюды вёскі, прысёлкі ды хутары „папрыходзілі": ёсць і Буякоўшчына, Бурыцкія, Чарнічкі, Галубовыя Лугі, Грабняк, Гукавічы, Камень, Клябанчына, Кленікі, Клім, Койлы, Канец, Курашава, Ляды, Ляшчыны, Лушчы, Максімоўшчына, Мяжлужжа, Мора, На Сэрэдняй, На Сядзяшчым, На Выпусце, На Заднім Грудзе, Над Курашэўскай Дарогай, Асоўка, Пад Асоўкай, Падборыца, Падпніска, Падрэчаны, Падвяжанка, Пры Каменіцкай Дарозе, Пры Кленіцкай Дарозе, Пры Койлаўскай Дарозе, Пры Карнянскай Дарозе, Ракавічы, Сапава, Шастакова, Слівова, Цінкоўшчына, У Наддатку за Асоўкай, Вежанка, Волька, Выжар, Загаць ды Збуч. Якія харошыя, самавітыя назвы, і такія ж людзі! Кажуць дзядзька Аляксандр ды Мікола: няма як нахваліцца нашага войта, які не забывае пра нас, старых. Можна зайсці да яго, усё растлумачыць, параіць, ну, і не забывае пра тое, што ім трэба, значыць, старэйшым, апрача таго што мусяць неяк пражыць, бо дбае пра іхні дух. Ушануе ўсіх і ў Дзень сеніёра. І ў Чыжах, і ў Кленіках збіраліся старажылы, нават больш чым па 60 чалавек. Вядома, больш удавіц. І бабулі весяляцца — раней адно кароў даілі, свету божага не бачылі, а цяпер часу больш на „разрыўкі", на зацікаўленне тым што наўкола адбываецца. Дзядзькі „такія хлопцы" (як сябе называюць) дык іх шануюць — і дроў нарубаюць, і прывязуць што трэба, то развесяляць, каб не тужылі. А цяпер і дарогі тут паладжаныя. Бо дзядзькі з сябрамі дабраліся на купальскае мерапрыемства на аўто, бо хто ж цяпер ходзіць. Сабралася кучка суседзяў, а адзін мусіць прысвяціцца — ён будзе за шафёра, піўца не вып'е. Але і без гэтага можна пагуляць. І дадаюць, што ў наступных выбарах, калі будзе стартаваць, падтрымку Васілюк будзе мець гарантаваную. Бо і пра маладых дбае. А тут з падтрымкай для ідэі свята прыйшлі гміне Маршалкоўская ўправа Падляшскага ваяводства, Міністэрства УСіА. Гміна рэалізуе з добрымі вынікамі таксама шмат іншых праектаў, пра якія са сцэны ўспамінаў па-беларуску дырэктар Гміннага цэнтра культуры ў Чыхаж Юры Якімюк, уручаючы ўзнагароды найлепшым канкурсантам, м.інш. Дыяне Капытка з Крывой, пераможцы фатаграфічнага конкурсу „Велікодныя звычаі і абрады ў рэгіёне Белавежскай пушчы — вяртанне да традыцыі".

„Чыжавяне" славяць тутэйшую зямлю

Лянеўская публіка не падвяла

Бачаць старажылы і гасцей з суседніх гмін, вось ёсць і мякішоўцы — з „Бельськовай", і з самога Беластока. Не лічыўшы ўжо гасцей, што на сцэне: і свойскія „Незабудкі" з Курашава, „Чыжавяне", „Збучанкі" ды „Лясная гавэнда", ласінкаўская маладзенькая „Зараначка", студзіводская „Жэмэрва"... Ёсць ансамблі з Гайнаўскага дома культуры — са „Студыі песні", вакальны ансамбль „Тройка", і ансамблі з Беларусі — „Пружаначка", „Лявоны" ды „Гасцінец". Паказалі свае ўмеласці пагранічнікі ды пажарнікі, правяліся конкурсы, у якіх можна было праявіць і веды, і спрыт, і апетыт. Малечы маглі пагуляць у „мястэчку гульняў" для дзяцей, старэйшыя патанцаваць адразу на мураве. На небе над сцэнай луналі вясёлкавыя клубы дымоў, стракацелі гарматкі з феерверкамі, што фантанамі білі ва ўсё чарнейшае неба. Амаль ніхто не збаяўся страшэннай буры, якая згуртавала над ваколіцай чорна-малінавыя хмарыскі і лупіла ў зямлю маланкамі ды перунамі. Плылі песні, паплылі вянкі па вадасховішчы, пабудаваным у 2003 г. на сродкі па праекце самаўрадавага згуртавання гмін Еўрарэгіёна Белавежская пушча. На рэчцы Локніцы, якая пакуль выглядае як роў, а якой старыца была вельмі маляўнічай (узровень грунтавай вады змяльчэў з-за „воднай гаспадаркі"), пабудаваны яшчэ вадасховішча ў Лядах, мае быць і ў Курашаве. „Славім мы сваю зямлю" („Чыжавяне") кожны найлепш, як умее.

Сам войт Гарадоцкай гміны Веслаў Кулеша вядзе карагод!

Найбольш адважныя кінуліся ў Супрасль!

Не мае праблем з вадой вёска Залукі Гарадоцкай гміны, што над ракой Супраслю. Не мае і з уласнай актыўнасцю жыхароў, якія ратуючы сябе і сваю школу, якая з'яўлялася і цэнтрам культуры, заснавалі Згуртаванне вёскі Залукі над Супраслю. І паплылі вянкі па Супраслі ў нядзелю, 28 чэрвеня. Уся Гарадоцкая гміна і яе сябры сабраліся ў гэтай вёсачцы, адлеглай на 10 км ад гміннага цэнтра. На самавітую сцэну, аздобленую купальскімі матывамі, за школьнай пляцоўкай, выйшлі спачатку гмінныя ўлады ды перш за ўсё жанчыны з ансамбля „Каліна", якія складаюць корань усіх перамен і падтырмкі традыцыі ў Залуках. У гэты раз „на пенсію пайшла", сёння ў „цывільным" адзенні, Валянціна Паплаўская, маці і бабуля ўсіх залучанскіх гуртоў — яшчэ і „Калінкі", і „Каліначкі". Выступілі і яны, і сябры з „Расспяванага Гарадка", і „Арляне". Прыехалі ў Залукі таксама сябруючыя з гарадоцкай гмінай „Журавінкі" з Агароднічак у Супрасльскай гміне, і пенсіянерская „Чорная ягада" з Чорнай-Беластоцкай. Хто скажа: „пенсіянеры" — пачуўшы гарадоцкія „Асенні ліст", ці мясцамі падсівелую ўжо капэлу „Хутар"?! Тое, што яны ўжо „вечныя", не значыць, што старыя. Пераймаюць іхнія традыцыі маладыя спевакі з „Казкі", ідуць бадзёра калінавым следам усё больш славутыя маладыя выканаўцы. Толькі маладыя юнакі кінуліся ў Супрасль, лавіць вянкі. У гэты раз адна залучанская традыцыя не працягнулася — да канца трымалася адметная пагода, а хмаркі былі ласкавыя, пераліваліся колерамі. Мяккія туманы засалі падрэчкі і ўзлескі, а пад сцэнай у Залуках доўга гойсалі старыя ды малыя пад музыку нарваўскага „Партала" ды беластоцкай „Сказкі".

Пасля выбараў

Перажылі мы чарговы „грамадзянскі экзамен" — еўравыбары. Ух! Урэшце будзе спакойна. Трэба прызнацца, што апошнія выбары прадстаўнікоў у еўрапейскі парламент паставілі перада мной сур'ёзную дылему: галасаваць ці байкатаваць? Абодва варыянты былі магчымымі па патрыятычных прычынах! Тое, што галасаванне — патрыятычны абавязак, убівалі мне ў галаву здаўна. Зрэшты, калі ў нас поўная дэмакратыя, то па-мойму грамадзянін павінен карыстацца не толькі ўсялякімі яе здабыткамі, але мець і нейкія абавязкі, у тым ліку абавязак галасавання, каб не паўтаралася, што 20% народу на гады вырашае лёс дзяржавы і яе насельніцтва. Але вернемся да маёй дылемы. Я — як патрыёт, галасаваць павінен. Але адначасна я не павінен прыкладаць рукі да аслаблення краіны шляхам высылкі ў замежжа самых лепшых сыноў і дачок нашага грамадства. Менавіта гэта нам пагражае, калі еўрадэпутацкія мандаты атрымаюць найлепшыя кандыдаты. Плакаты і лістоўкі ахвотных апынуцца пры брусельскім карыце, прабачце — памылка: аддаць сябе брусельскім справам у карысць усяго чалавецтва, чытаў я вельмі ўважліва. І з кожнай спаглядалі на мяне твары вельмі заслужаныя краіне, спрактыкаваныя ў вырашанні праблем, вопытныя, якія турбуюцца за мяне і іншых простых смяротных. І як жа тут выпусціць з краіны такіх асоб? Гэта ж быў бы чысты сабатаж! Або возьмем дэпутатаў Сейма: гэта ж сам цвет народу. Толькі што пачалі аздараўляць яны краіну і людзей, а тут ужо Еўропа іх кліча! І мне трэба да гэтага прыкласці руку? Ніколі!

Былі сярод кандыдатаў і менш заслужаныя асобы, напрыклад, адзін дзядок з Беластока, якому ўжо пераваліла за семдзесят. І што ж ён можа ў такім узросце? Пара ўжо адпачыць, унукаў забаўляць, мемуары пісаць, а не мучыцца ў цягніках і самалётах, драмаць на зале пасяджэнняў, рызыкаваць сваім каштоўным здароўем для гэтых марных некалькіх еўра... Ну, хіба што пенсіі сапраўды мала, каб пражыць.

Так, нялёгкія дылемы кожныя некалькі гадоў прыносіць нам дэмакратыя. З аднаго боку ўсыпляе нас у перакананні, што нашы найлепшыя прадстаўнікі зробяць у краіне што трэба, а мяне можна спакойна глядзець тэлесерыялы ці каляровыя карцінкі ў прэсе. З другога боку застаўляе мне думаць і выбіраць. Дайце ж мне спакойна пажыць! Я не хачу думаць выпадкова кожныя 3-4 гады! Я папросту хачу жыць спакойна і не траціць часу і ўвагі на тое, што ад мяне не залежыць. І ведаць, што маёй краінай кіруюць не прайдохі, а толькі разумныя людзі, сур'ёзныя, сапраўды самыя лепшыя з найлепшых.

І між іншым таму з'яўляюся манархістам.

Марк ЦЫБАРТ

Калі б грошы з аўтастрад, будаваных пад „Еўра-2012", пайшлі на звычайныя дарогі...

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Транспартная развязка з кругавым рухам у Бельску-Падляшскім — адна з многіх інвестыцый на дарозе № 19 з выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў

Апошнім часам многа гаворыцца аб падрыхтоўцы да чэмпіянату Еўропы па футболе „Еўра-2012", які мае адбыцца ў Польшчы і на Украіне. Калі спынілася гаспадарчае развіццё на Украіне і сталі гаварыць аб вялікай рэцэсіі, паяўляюцца сумненні наконт магчымасцей арганізавання чэмпіянату ў гэтай краіне. Затое падрыхтоўка да футбольных змаганняў, а перад усім будова стадыёнаў у Польшчы ацэньваецца станоўча і толькі еўрапейскія спецыялісты апасаюцца ці ў нашай краіне паспеюць мадэрнізаваць усе патрэбныя для гэтага мерапрыемства чыгуначныя вакзалы і збудаваць пад „Еўра-2012" аўтастрады і даязныя дарогі згодна з еўрапейскімі патрабаваннямі. Паявіліся нават выказванні, што паспяхова вылітыя асфальтавыя палосы могуць хутка паразбівацца, паколькі інвестары могуць не паспець выканаць пад імі адпаведных падбудоў. Хаця многа грошай на спартыўныя інвестыцыі будзе выдаткаваных з еўрасаюзнага бюджэту, дык трэба будзе дакладаць да іх свае сродкі — з дзяржаўнага і гарадскіх бюджэтаў ды прыватных інвестараў, якія збудуюць стадыёны і гатэльна-гастранамічную інфраструктуру. Балельшчыкі рады футбольнаму мерапрыемству, але жыхароў „усходняй сцяны" непакоіць канцэнтрацыя вялікіх дарожных інвестыцый у бліжэйшых гадах на захадзе краіны і ў яе цэнтральнай частцы.

Таксама намеснік старшыні Павятовай рады ў Бельску-Падляшскім, дырэктар бельскай „тройкі" Васіль Ляшчынскі і заадно трэнер гандбольных каманд, які з'яўляецца вялікім прыхільнікам спартыўных спаборніцтваў і інвестыцый, сказаў, што прызначэнне вялікай колькасці еўрасаюзных сродкаў на будову аўтастрад і стадыёнаў пад чэмпіянат Еўропы па футболе „Еўра-2012" можа спрычыніцца да абмежавання еўрасаюзных грошай, прызначаных на інвестыцыі ў Падляшскім ваяводстве. Хаця заўважаецца, што дыспрапорцыі, якія ўзнікнуць з-за падрыхтоўкі да „Еўра-2012" паміж заходняй і ўсходняй часткамі Польшчы, будуць абмяжоўвацца пазней і ў чарговых гадах адносна больш грошай будзе ісці на „ўсходнюю сцяну", то на практыцы гэты працэс можа быць вельмі доўгім, а без большых сродкаў на дарожныя інвестыцыі і без добрых дарог складана будзе прыцягнуць вялікіх інвестараў у наш рэгіён. Калі хуткімі тэмпамі пачала мадэрнізавацца краёвая дарога № 19, што з Сувалкаў праз Беласток, Бельск-Падляшскі і Люблін вядзе на поўдзень Польшчы, а побач Кляшчэляў і на іншых адрэзках стала перабудоўвацца іншая краёвая дарога № 66, што з Бельска вядзе да пагранперахода ў Полаўцах, група „Ікея" рашылася збудаваць фабрыку ў Арлянскай гміне якраз побач гэтай краёвай дарогі. Каб сусветны інвестар рабіў капіталаўкладанні ў гміне Орля і разбудоўваў сваё дрэваапрацоўчае прадпрыемства (прадбачваецца, што можа працаваць у ім нават пад дзве тысячы чалавек), трэба надалей перабудоўваць і мадэрнізаваць дарогі, якія спалучаюць Арлянскую гміну з іншымі рэгіёнамі Польшчы і збудаваць добрую даязную дарогу, накшталт аўтастрады, з цэнтра нашай краіны на Падляшша.

— З таго, што я ведаю, не прадбачваецца ў бліжэйшым часе больш перабудоўваць і мадэрнізаваць краёвую дарогу з Бельска-Падляшскага ў напрамку Кляшчэляў, — заяўляе войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк.

Хаця гаворыцца аб будове кальцавой краёвай дарогі вакол Бельска, невядома калі канкрэтна гэты праект будзе рэалізаваны. Інвестыцыі на згаданых дзвюх дарогах праводзіліся з еўрасаюзнага бюджэту і сродкаў Генеральнай дырэкцыі краёвых дарог і аўтастрад. З бюджэту гэтай апошняй многа сродкаў зараз будзе выдаткоўвацца на аўтастрады і даязныя дарогі да стадыёнаў, дзе будуць ладзіцца матчы ў рамках „Еўра-2012".

У агульным, дзякуючы сродкам з еўрасаюзнага бюджэту, у Польшчы на дарожныя інвестыцыі выдаткоўваецца большы адсотак валавога ўнутранага прадукту, чым, напрыклад, у Германіі ці Вялікабрытаніі, але там ВУП намнога большы, чым у нас і па колькасці грошай прызначаных на дарогі мы ў вялікай ступені адстаем ад згаданых і многіх іншых „старых" краін Еўрасаюза. Калі аднак паглядзець на дарожныя інвестыцыі, што рэалізаваліся на працягу апошніх пяці гадоў (калі мы ў Еўрасаюзе) на захад і ўсход ад Віслы, дык дыспрапорцыя была вялікай у карысць захаду, а зараз, з-за падрыхтоўкі да футбольнага чэмпіянату, стане проста аграмаднай. Па шчыльнасці дарожнай сеткі Польшча трымаецца ў сярэдзіне Еўрасаюза. Аднак справа не ў даўжыні ўсіх дарог, але ў іх якасці.

Замала сродкаў на нашы дарогі

Зараз рыхтуюцца шматлікія рапарты аб стане нашых дарог і патрэбах іх перабудовы і мадэрнізацыі. Многа нашых дарог, ужо падрыхтаваных да грузавога транспарту, перабудоўвалася ў пяцідзесятых і шасцідзесятых гадах са звычайных палявых дарог, а ўжо з сямідзесятых гадоў пачынаецца замаруджванне ў іх будове, перабудове і мадэрнізацыі. Найгорш было з дарожнымі інвестыцыямі ў нашай краіне пасля палітычных і гаспадарчых перамен 1989 года, калі значная частка дзяржаўнага бюджэту адводзілася на сацыяльныя выдаткі. На дарогах Гайнаўшчыны і Бельшчыны таксама была бачна адсутнасць інвестыцый якраз у гэтым перыядзе, а дарожныя службы вясной мелі вельмі многа работы, бо мусілі заліваць асфальтам многа дзіраў. Аднак пасля выдаткі на дарожныя інвестыцыі большалі як у краіне, так і ў нашых гмінах. Вялікі пералом у галіне перабудовы і мадэрнізацыі нашых дарог адбыўся пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза. Гэта ў асноўным тычылася краёвых і ваяводскіх дарог, бо апошнім часам менш вонкавых грошай ішло на мадэрнізацыю дарог у нашых гмінах. Нашы войты, бурмістры і старасты хадайнічаюць зараз за прыдбанне еўрасаюзных сродкаў на дарожныя інвестыцыі на сваёй тэрыторыі і дабіваюцца ў ваяводскім сеймику рамонтаў ваяводскіх дарог. У параўнанні да патрэб інвестыцый на ваяводскіх дарогах як на Гайнаўшчыне, так і на Бельшчыне зараз замала. Некалькі гадоў таму планавалася перабудова вуліцы Варшаўскай у Гайнаўцы, якая з'яўляецца ваяводскай дарогай (на адрэзку ад уезду ў шчыльную забудову горада з боку Кляшчэляў да крутога павароту), і будова скрыжавання з кругавым рухам (на гэтым павароце). Інвестыцыі гэтыя фінансаваліся б з еўрасаюзных сродкаў і грошай з бюджэту Падляшскага сеймика, але праект іх выканання быў зняты з ваяводскага спіса прызначанага для рэалізацыі (рашэнне было прынята раней і, думаю, што нельга яго спалучаць з падрыхтоўкай да чэмпіянату Еўропы). У бліжэйшым часе прадбачваецца рамонт адрэзка з Гайнаўкі ў Навасады, на дарозе ў Заблудаў.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Дзень Яцка

Моладзь з Беластока і Пуньска ля магілы Яцка Кураня

Калі ўпершыню ўваходзіш у кватэру па вуліцы Міцкевіча, 27 у Варшаве, у сэрцы маеш усе лепшыя людскія пачуцці. Адным цякуць слёзы, другія стараюцца на нечым засяродзіцца, чапляюцца чарговай кніжкі з гэтых соцень, якія стаяць навокал на паліцах колеру чырвонага дрэва. А можа і карычневага. Помню, што паліцы былі цёмныя і кантраставалі з белымі сценамі салона, у якім стаялі вялікі дряўляны стол і фатэль. І яшчэ канапа, каб прысесці да гутаркі, а можа і прылегчы з кніжкай. Не ведаю ў які спосаб кніжкі чытаў Яцэк Курань, але напэўна чытаў іх многа. А нават больш: „Калі па шлюбе сказала, што расчаравалася, бо замала чытаю, зразу я павысіў колькасць чытаных кніжак". Так успамінаў Яцэк Курань сваю першую любоў, першую жонку Гайку. Яе здымак стаіць каля кніжак, яе твар з усмешкай таксама глядзіць са сцяны. Няма ўжо ні яе, ні Яцка. Зараз гаспадаром у адной з важнейшых кватэр Варшавы з'яўляецца другая жонка Яцка — Данута Курань. Кожнага дня з вялікай рашучасцю ўшаноўвае яна памяць свайго мужа ды апякуецца яго спадчынай.

Сяброўства і зразуменне

Сяброўства з Данусяй пачалося з восені мінулага года, калі сустрэліся мы ва Усеагульным універсітэце імя Яна Юзафа Ліпскага ў Тэрэмісках. З гэтага моманту пачаўся вельмі інтэнсіўны міжкультурны дыялог. Інспіравала яго Маршалкоўская ўправа, а зараз зусім свабодна працягваюць яго апекуны ўніверсітэта ў асноўным супольна з беларускай меншасцю на Падляшшы. Асабліва актыўным з'яўляецца Аб'яднанне бацькоў АБ-БА, якое не толькі прыязджае ў Тэрэміскі, але перш за ўсё сябруе з Данусяй Курань і яе блізкімі. Сёлета 17 чэрвеня адзначалася пятая гадавіна з дня смерці Яцка Кураня. Заўсёды ў Варшаве пры яго магіле адбываецца адкрытая сустрэча сяброў і тых усіх, якім асоба памерлага была блізкай.

— Я вельмі хацела б, каб сёлета беларускія і літоўскія дзеці прыехалі на магілу Яцка, — папрасіла нейкага дня Дануся і гэтая прысутнасць зразу стала фактам, бо ў такіх сітуацыях адмаўляць ніхто нават і не думае. — Ці можаце пачаць з „Магутны Божа", — дадала амаль непрыкметна.

Угодкі адзначаліся ў суботу, 20 чэрвеня, але яшчэ дзень да іх моладзь з Сейн, Пуньска і Беластока сабралася ў спадарства Занусі, вялікіх сяброў Яцка і звязаных з ім людзей. Візіт прынёс нам многа ўражанняў, бо прыгожае месца, поўнае дрэў і кветак змянілася ў вялікую міжкультурную прастору. Дзеці спявалі па-беларуску, па-літоўску, па-польску і на іўрыце. Дзеткі таленавітыя, таму хутка прывучыліся да чарговых музычных прапаноў ды нашага беларускага гімна „Магутны Божа". Змяркала, калі з Лясак пераехалі мы ў хату Яцка Кураня на варшаўскім Жалібожы.

— Вы начуеце ў Кураня... — уздыхалі ў бок літоўцаў маладыя беларусы.

Нам трэба было пераначаваць у іншых былых апазіцыянераў. Славутая хата Кураняў не ў змозе памясціць столькі людзей, колькі кніжак навокал.

Не думала я раней, што дзеці так добра зарыентаваныя ў значэнні асобы Яцка Кураня. Разумелі, што хата па вуліцы Міцкевіча абазначае нешта больш, чым толькі месца, дзе жыў Яцэк Курань. Ведалі, што партрэт на сцяне прадстаўляе першую жонку Яцка, разумелі, што яна мела можа і найбольшае значэнне для становішча нацыянальных меншасцей у адроджанай Польшчы. Калі вечарам адыходзіла стомленасць, дзеці перад сном доўга яшчэ абменьваліся ў сваім крузе ведамі наконт сям'і Кураняў. Паяўляліся інфармацыі са штодзённай прэсы, каляровых часопісаў ці тэлепраграм. Шмат пыталі. Асноўнае, што стараліся ўсё зразумець і ведаць чаму Яцэк Курань для нас такі важны.

Рэпетыцыя ў спадарства Занусі

Пра мары

На просьбу нашых пуньскіх сяброў прыехалі мы на Вайсковыя могілкі раней, каб супольна заспяваць пры магіле Ежы Фіцоўскага, дзе таксама сабралася пару блізкіх асоб. Раней амаль ніхто з нашай групы не пабываў на гэтых гістарычных могілках. Была тады нагода пашпацыраваць між магіламі славутых асоб, бо варшаўскія Павонзкі — гэта таксама месца экскурсій, прагулак, гістарычнай памяці. Рышард Капусцінскі, Марэк Карп, Фларыян Няўважны — гэтыя прозвішчы прыцягваюць беларусаў, прымушаюць прыпыніцца, задумацца. Прыцягваюць увагу таксама помнікі Баляславу Беруту ці Уладыславу Гамулку... Дакранаемся да гісторыі, якая нас непасрэдна не кранула. Калі падышлі мы да магілы Яцка, акружана яна была невялічкім натоўпам.

— Я не прыдаюся да публічных прамоў, да інтэрв'ю з журналістамі, — дзень раней казала нам Дануся. — Тое, што сапраўды хачу сказаць, заўсёды прыходзіць у галаву пазней.

Але пачала сустрэчу спакойна, сціпла, з далікатнай, амаль заўсёднай усмешкай на твары. Папрасіла ўзяць голас Кароля Мадзалеўскага, у гэты момант перш за ўсё сябра, а не прафесара, які распавёў простую жыццёвую гісторыю, звязаную з Яцкам. Гаварыў і Пётр Тыма, украінскі дзеяч, які стараўся ад імя ўсіх меншасцей падзякаваць Яцку за яго ангажаванасць. У гэты раз маліўся таксама будыйскі манах (склалася традыцыя, што кожны год пры магіле моляцца паводле іншага абраду). Яцэк быў адкрыты на ўсіх людзей, нягледзячы на нацыянальнасць ці веравызнанне. Таму між прамовамі спявалі польскія, беларускія ды літоўскія дзеці. Выконвалі яны песні сваіх продкаў, бо сёння няма без учора. Ведаем тое і ў кантэксце Яцка, і ў кантэксце нас, беларусаў.

— Ёсць з намі таксама кіраўнік школы з Лодзі, якая першай прыняла імя Яцка, — прывітала жанчыну Дануся. — Першапачатковае дапаможнае значэнне куранёўкі — славутага супу, прыдуманага Яцкам, сёння дэвальвавалася, — працягвала, — але шчасліва ідзе новае, бо зараз школы, якім прысвойваюць імя Яцка, у скарачэнні называюць куранёўкамі. Марыцца мне, каб так прынялося і каб узнік універсітэт Яцка Кураня.

У выпадку такіх людзей як Дануся мары здзяйсняюцца вельмі хутка...

Аўтарытэт

„Нядаўна падумаў, што аўтарытэтам можа быць Курань, але чаму, гэта доўгая гісторыя (...) не мушу хіба табе казаць (...) гісторыя непахіснага чалавека, які ўмеў перафармуляваць свае погляды, спачатку вельмі моцныя, але ўмеў іх перафармуляваць, але не адрэзацца, меў нейкую базу; камуніст, які ваяваў з сістэмай, узяў адказнасць, страшную адказнасць за сваю апазіцыйнасць, урэшце памёр з поглядамі, якія меў з самога пачатку, якія меў у сапраўднасці праз цэлае жыццё".

Гэта фрагмент з маёй магістэрскай працы. Адзін з суразмоўцаў, малады беларус, так адказваў на пытанне пра аўтарытэты. Яцэк Курань для многіх быў аўтарытэтам, але і сам глядзеў у такі спосаб на іншых. Не думаў пра сябе як пра самага мудрага, але меў свядомасць чалавека адказнага і поўнага веры, што з кожнай сітуацыі ёсць выхад, а перад намі вялікая будучыня, толькі трэба ісці паслядоўна крок за крокам.

Страта адданага сябры

Памёр віцэ-прэзідэнт горада Познаня — Мацей Франкевіч, які пасля падзення з каня, у палове траўня, ляжаў у бальніцы. У снежні спадару Франкевічу споўнілася б 51 год.

Мацей Франкевіч нарадзіўся ў 1958 годзе. Быў намеснікам прэзідэнта па справах асветы, культуры і спорту. Вучыўся ў Познаньскай палітэхніцы, быў сябрам Незалежнага звязу студэнтаў, актывістам Змагарнай салідарнасці і Партыі свабоды. У чэрвені 2007 г., за заслугі ў змаганні за незалежнасць Польшчы і дэмакратыю, з рук прэзідэнта РП Леха Качынскага атрымаў Афіцэрскі крыж Ордэна Адраджэння Польшчы.

Сябры ведалі спадара Франкевіча як аматара спорту, які шматразова ўдзельнічаў у познаньскім марафоне, ездзіў на кані, займаўся парашутным і горным спортам. Штогод удзельнічаў у праездах уланаў праз Познань, спартовых змаганнях, і рэканструкцыях гістарычных бітваў.

Мацей Франкевіч шматразова спрыяў вырашэнню беларускіх пытанняў у Познані. Пры падтрымцы прэзідэнта Беларускаму культурна-асветнікаму цэнтру было прадстаўлена сядзібнае памяшканне. Віцэ-прэзідэнт асабіста ўдзельнічаў у многіх беларускіх мерапрыемствах, а ў 2006 годзе разам са Станіславам Шушкевічам урачыста адчыняў Дні Вольнай Беларусі. Апошнім часам Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр заручыўся падтрымкай спадара Франкевіча па ўстанаўленні помніка Францыску Скарыну ў Познані. Смерць Мацея Франкевіча для мясцовых беларусаў стала стратай адданага сябры.

Віталь ВОРАНАЎ

Сход у Гарадзіску

У Гарадзіску Нарваўскай гміны 17 чэрвеня адбыўся агульны сход жыхароў вёскі, — расказвае Ян Хіліманюк. — На сход прыбыў намеснік войта Міраслаў Жукоўскі. Абмяркоўвалася справа змены назвы вёскі, паколькі ў некаторых жыхароў у дакументах запісана Гродзіска (Grodzisko), а ў іншых — Гарадзіска (Gorodzisko). Гмінныя ўлады прапануюць перайменаваць вёску на Гарадзіска (Horodzisko). Каб сход быў паўнамоцным, неабходная прысутнасць 20% жыхароў вёскі. На сход прыйшло 50% сяльчан, у асноўным жанчыны. У выніку галасавання аказалася, што сабраныя не згадзіліся на перайменаванне вёскі. Прычына адна — пасля змены назвы вёскі трэба было б змяніць усю дакументацыю. А на такі выдатак у людзей не хапае грошай. У вёсцы ў асноўным жывуць пажылыя людзі, пенсіянеры, якім не стае грошай на пражыццё. Можа ўлады дапамаглі б вяскоўцам пакрыць кошты замены пасведчанняў асобы і іншых дакументаў, а тады яны падтрымалі б прапанову.

Андрэй ЯЛОЗА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

„Бора-Здруй” — краіна чараў

Я заўсёды думала, што сапраўдным адпачынкам для майго цела і душы з’яўляецца купанне, кароткі сон на свежым паветры і шпацыр па соннай вуліцы вёскі. Аднак я памылялася. Я мела магчымасць пабываць на Сустрэчах „Зоркі” ў Новым Ляўкове. Разам з новымі сябрамі я знаёмілася з тайнамі журналістыкі. Месца сустрэчы захапіла мяне сваёй блізкасцю да Белавежскай пушчы. Ніхто тут не парушыць спакою і цішыні, таму што двор пільнуе сабака Шарык. Мы нават сярод лесу мелі заняткі. Ніхто не хацеў траціць часу ўпустую. Цэлы дзень мы шчыра працавалі пры сваіх фельетонах, інфармацыях, рыхтавалі сустрэчы з гасцямі... Вечарам глядзелі фільмы і размаўлялі пра свае зацікаўленні. Пасля вячэры быў нават час на жахалкі і смешныя анекдоты. Нам здарылася забыцца пра час і прасядзець да позняй гадзіны. Праўда, пасля страшных расказаў не хацелася спаць. Усе засталіся ў адным пакоі. У рэшце рэшт мы здрамнуліся на некалькі гадзін. Я па сённяшні дзень не магу зразумець як нас восем асоб памесцілася на адным ложку. Раніцай усе былі заспаныя, але ведалі, што трэба быць у добрай форме, бо чакалі нас цікавыя заняткі і інтэлектуальная праца. Нашы гаспадары прапанавалі нам паляжаць у гарачай пясочніцы-пляжы або папарыцца ў лазні. Усе кінуліся на гарачы пясок. Лазняй мала хто пакарыстаўся, таму што мы не ведалі дзе ўключальнік святла. І такім цудам мы кожны дзень здзяйснялі „пад’ём” на ніве беларускай, школьнай, журналістыкі...

„Павуцінне”, ***Аня Келбашэўская***
(Гімназія ў Нарве)

Фота Тамаша Ляшкевіча

Аня Келбашэўская (другая злева) з сяброўкамі

Белавежская дыета

Калі ўдзельнікі XXIII Сустрэч „Зоркі” пабачылі багата застаўлены стол у час першай вячэры, амаль не пападалі ад уражання. Мігам забылі пра салодкае і фаст-фуды і са смакам з’елі амаль усё, што падрыхтавалі сімпатычныя кухаркі.

Прыклад даў Тамаш Ляшкевіч з Гайнаўкі, які займаецца спортам:

— Мой трэнер загадаў мне патаўстолькі смачна гатаваць, але і прыпрасіць сваіх гасцей. Пры нагодзе мы даведаліся, што ўласнік асяродка, пан Барыс Казлоўкі, ні разу ў жыцці не з’еў так папулярнага сярод моладзі фаст-фуда. Гэта заставіла нас задумацца і таму спецыяльна для нашых чытачоў мы падрыхтавалі „белавежскую дыету” з улікам каб патаўсцець!

7.00 — пад’ём!

Фота Ганны Кандрацюк

Пані Людміла Казлоўская частавала нас свойскімі стравамі

цець, — апраўдваўся ён. — Думаю, што пасля гэтага тыдня такое атрымаецца...

Вядома! Малако, сыр, фаршыраваныя яйкі, мёд, агародніна, масла, вяндліна, печаныя пірагі — усё натуральнай вытворчасці ды падрыхтаванае хатнім спосабам. Як удалося нам даведацца, сакрэт добрага смаку заключаецца ў блізкай сувязі паміж кухаркамі. Усе яны — сямейка. Яны ўмеюць не

Хаця гэтае слова абазначае „проста падняцца з ложка”, мы спачатку ўспрынялі яго як „падснеданак”. Значыць, у гэты момант можаце есці салодкае і чыпсы, таму што *кадра* яшчэ спіць.

8.00 — снеданне:
— суп з малака проста ад каровы,
— фаршыраваныя яйкі або яечня,
— бутэрброды з маслам і сырам,
— бліны або аладкі,
— гарбата з мёдам.

14.00 — абед:
— суп з агародніны,
— свіное філе з маладой бульбай і памідорамі,
— кампот з чарніц з Белавежскай пушчы.

19.00 — вячэра:
— бутэрброды з мясам,
— яблыкі,
— свойскі сыр з мёдам,
— малако,
— шарлотка.

Смачна есці!!!

„Аранжавая хатка”, ***Наталля Кандрацюк-Свярубская***
(III Агульнаадукацыйны ліцэй у Беластоку)

ДАВЕДНІК ПА НАРАЎЧАНСКАЙ ГМІНЕ

Практычныя парады і не толькі...

— Калі ў дарозе заспее вас ноч, або проста захочацца спаць, прапануем павярнуць у Новае Ляўкова і пашукаць пансіянат Бора-Здруй.

— У гміне летам вельмі горача. Мясцовыя людзі маюць тут свой спосаб на ахалоду. Можна паплаваць у Семяноўскім возеры, а пасля пасмажыцца на пляжы.

— Калі вам будзе дакучаць голад, абавязкова пашукайце харчоў у мясцовых людзей. Тут вараць самыя смачныя абеды на свеце!

Фота Ганны Кандрацюк

Месца эмоцыяў — „Бора-Здруй”

— Можа цікавіць вас мясцовая рэлігія і культура? Калі так, паглядзіце старажытную царкву ў Старым Ляўкове, Галерэю Тамары Саланевіч у Нараўцы, сустрэньцеся з мясцовымі людзьмі на фэсце ў Нараўцы.

— Калі ў вас няма машыны, не перажывайце. Мы прапануем найлепшы і танны транспарт — ногі або веласіпед!

— У гміне многа грыбных лясоў. Таму бярыце кошык у рукі і ў лес!

— У Новым Ляўкове вы можаце паглядзець ферму аленяў — даніэляў — і пазнаёміцца з гэтымі звярамі.

— Не дазваляйце сабе на нуду. У Нараўцы працуе бібліятэка з мноствам польскіх і беларускіх кніжак.

„Аранжавая хатка”, ***Эля Коршак***
(Белгімназія ў Бельску-Падляшскім)

ГІСТОРЫЯ ПРА ЧОРНУЮ МАГІЮ

Гэтая гісторыя здарылася тады, калі Казічак знайшоў на гарышчы таўшчэзную кніжэрыю „Чорная магія" ды бабахнуў яе на стол. Ды так, што пыл ад страшнага гэтага фаліянта аж разарваў яму наздрыны. Ну, можа, не разарваў. Але чхаў ён так, што хутка суседзі зверху затупацелі нагамі ды закрычалі крыкамі, каб Казічак так дзіка не чхаў.

Чхаць ён праз нейкіх тры-чатыры гадзіны ўсё ж перастаў. Але і думаць не думаў болей не дакранацца да гэтай кніжэнцыі. Наадварот! Бясстрашны хлапчына адразу ўспомніў, як цвёрда хацеў, каб звярнула на яго ўвагу самая прыгожая ў іх класе дзяўчынка Даротка, і вырашыў...

Карацей, гэткую справу хлапец задумаў, што, па-першае, адразу ў ягонай кухні засмуродзіла здохлымі мышамі, прэпаравамымі кратамі, перакручанымі хрушчамі, па-другое, на даху загікатала надзьмутая ў бязмежны пухір амерыканская канэктуканская жаба, а па-трэцяе, сам бясстрашны Казімір стаяў сярод пакоя з поўным ротам чароўных грука-іскра-высякальных камянёў і пускаў тым ротам сэрцазнішчальнае полымя. О, гэта было жахоцтва, страхлюндрыя, магіятызм!!!

І ўвесь гэты магіятызм прызначаўся, каб завалодаць канчальна і беззваротна сэрцайкам той самай Дароткі, якая ніякім ведам не ведала, што супраць яе скіравана такое вось чарнаспраўства. Таму і ўвайшла спакойна ў пакойчык Казіка, калі малец занёс іржавы стары мексіканскі нож мачэтэ над шыяй ашалелага пеўніка, які наравіў вырвацца прэч, а болей — дзеўбануць у вока юнага, аднак суворага, што твой дзедаўскі рэмень, чарнакніжніка.

А ў пакоі кіпела магма, кішэў чэрвяскрут, трэслася жыжамяшалка!.. Нічога не сказала Казінею Даротка. Толькі дастала з прыгожых сваіх ваканятак маленькія дзве жарынкі ды спакойна і ціха ўклала іх у далоні хлапчыны.

І — сталі юначыя рукі — сцяблінамі квітнеючых руж. А ружы сталі — вачамі, дзе квецень і шал, таямніца і шэпт, дождж і пяшчота. А дождж стаў — кроплямі, грукамі, неадрыўным вільготным спляценнем затоеных, крыху самотных, зачараваных сэрцаў.

А вы кажаце, што магія — гэта не проста.

Урэшце, магчыма вы і маеце рацыю?..

Ваш Дзядзечка Сід
18 траўня 2009 г., Кобрын

Фота Ганны Кандрацюк

Дзяўчаты з Нарвы ў спектаклі „Пярэстая красуля"

Міра ЛУКША

Клень з Кленік

Любіць цень
рыбка клень.
Верацяном
ён пад бервяном
схаваецца,
вачыма ў круглай галаве
ўзіраецца;
завуць яго й галавачом,
бялухай, жабчыкам, яльцом,
парыем, ляльчыкам, ляльцом,
зэснічкам, парухам ды клінём...
Ну й галавач:
якая галава, пабач!
І круглы рот,
зубоў ім плот,
а ўсе ў два рады
— з імі няма бяды! —
бо рады клень паесць.
І лусак сорак шэсць
па кожнаму баку.
І быструю раку
малыя аблюбуюць,
шумяць там і катлуюць
у кампаніі клянёвай,
у моладзі вясновай,
старэйшы ж клень за дня
хаваецца ля дна...
Глянеш — і клень уцёк
у вільготны цёмны бок.
У Кленіках —
прамілы цень.
І іх з кляніхай клень
аблюбаваў,
сваё ім імя даў.

Музыка з кайфам

„Мясцовыя" для мясцовых?

Калі любіце музыку і хочаце творча сарганізаваць свабодны час, хопіць сабрацца, узяць інструменты і пачаць іграць. Зразумела, трэба больш-менш валодаць нейкім інструментам, а мой вопыт падказвае, што і гэтага „больш-менш" дастаткова, каб у маладым узросце атрымалася нешта цікавае. Прыкладам могуць быць згадваныя раней гурты „Клюквы" ці „Гоман".

У Беларусі таксама знаходзім прыклады людзей, якія паглядзелі на іншых і вырашылі самі пачаць гульню ў музыку. Прыкладным гарадком з'яўляецца Бяроза, дзе папулярнасць гурту „Б:Н" падштурхнула моладзь і так узніклі „Кальмары" і „Мясцовыя". Сёння раскажам пра „Мясцовых".

Гурт быў створаны яшчэ ў лютым 2004 года, але „днём народзінаў" лічыцца 30 красавіка, калі адбыўся іх дэбютны выступ у мясцовым доме культуры. У наступным годзе сябры гурту паступілі ў вышэйшыя ўстановы, але абяцалі сабе вяртацца ў Бярозу і працягваць супрацоўніцтва. Тады ўпершыню гурт выехаў па-за межы горада, што для іх было вялікім дасягненнем. Калі наведалі ўжо Брэст, захацелася ім больш. Хутка пачалі запісваць дэма. Дзякуючы працы і амбіцыі былі запрошаны ў сталічны Мінск, а таксама ўдзельнічалі ў прамоцыі альбома „Жыве рок-н-рол" старэйшых сяброў з „Б:Н". Урэшце перасяклі мяжу Еўрасаюза і прэзентавалі сваю творчасць на фестывалі „Sounds of Borderland" у польскім гарадку Вішніцэ. Пішуць і спяваюць пра звычайныя, штодзённыя справы маладых людзей, пра пачуцці і з'явы, якія іх кранаюць.

Зараз тэмп іх развіцця крыху запаволіўся. Вядома, што і вучоба, і праца забіраюць шмат часу, але музыкі ўпэўнены, што не сказалі яшчэ апошняга слова, тым больш, што іграюць для сябе, сяброў ды жыхароў Бярозы і ваколіц. Часам удаецца ім паехаць недзе далей, але не без прычыны гурт называецца „Мясцовыя", праўда?

i_basovka@o2.pl

КРЫЖАВАНКА



1. Зялёная ў агародзе.
2. У школе між перапынкамі.
3. Сапраўднае імя Якуба Коласа.
4. Колькі дзён у месяцы верасні?
5. Інструмент, на якім любім іграць ля вогнішча.
6. Без яго цяжка на экскурсіі.
7. Прыметнік ад слова „дзіця".
8. Жонка ката.

„Павуцінне", *Лукаш Зіневіч* ***(Гімназія ў Гарадку)***, *Аня Келбашэўская* ***(Гімназія ў Нарве)***

Польска-беларуская крыжаванка № 25, 26, 27

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 21:

Мост, колеры, шалік, марак, палац, пан, галінка, рака, на, сок, цвёрды, горы, язычок.

Мера, парог, малако, шалік, карнацыя, Полацак, лік, анёлы, лек, ар, дыван, цырк.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Ася Стоцкая, Юстына Тамашук, Марыёля Анішчук, Агата Грыгарук, Ася Тарасюк** з Дубін. Віншуем!

Ці будзе пабольшаны парк?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Такое пытанне паяўляецца ў размовах жыхароў Гайнаўкі і наваколля. Але наймацней гэтая тэма хвалюе жыхароў Белавежы і пушчанскіх вёсак. Менавіта радныя Белавежскай гміны маюць летам гэтага года вырашыць ці даць згоду на пабольшанне Белавежскага нацыянальнага парку на лясныя тэрыторыі сваёй гміны, з выключэннем палян, на якіх знаходзяцца Белавежа, Пагарэльцы, Тэрэміскі і Буды. Прадбачваецца таксама пабольшанне Белавежскага парку на 10-20% на тэрыторыі Броўскага надлясніцтва, распаложанага ў Нараўчанскай гміне, але тут таксама мусіць быць згода нараўчанскіх радных. Аднак, каб увогуле адбылося павелічэнне паркавай плошчы, самай важнай будзе згода радных Белавежскай гміны, у якой прадбачваецца ліквідацыя Белавежскага надлясніцтва. Затое новая прапанова Міністэрства асяроддзя не будзе непасрэдна тычыцца жыхароў Арэшкава, Лазіцаў ці Войнаўкі, бо не прадбачваецца павялічваць парк на тэрыторыі Гайнаўскай і Дубіцкай гмін, горада Гайнаўкі, ці суседніх гмін, у якіх пушчанскі лес расце толькі на невялікіх арэалах.

Радныя Белавежскай гміны вырашаць ці даць згоду на пабольшанне Белавежскага нацыянальнага парку. Міністэрства асяроддзя ставіць на гміну, частка жыхароў якой жыве з турыстычнай і агратурыстычнай дзейнасці. Іншым жыхарам прапануецца пакарыстацца сродкамі, між іншым, на ўцяпленне дамоў

Разам з прапановай пабольшання Белавежскага нацыянальнага парку, якую на чэрвеньскай сустрэчы з прадстаўнікамі самаўрадаў Гайнаўскага павета ў рамках святкавання Сусветнага дня аховы асяроддзя ў Белавежы прадставіў міністр асяроддзя Мацей Навіцкі (некалькі дзён раней спаткаўся ён з войтамі і бурмістрамі, каб распазнаць іх стаўленне да магчымай прапановы пашырэння парку), была запрапанавана таксама Белавежская праграма развіцця. Прадугледжваецца ў ёй, што ў асноўным Белавежская і Нараўчанская гміны ды горад Гайнаўка, калі будзе згода на пабольшанне парку, атрымаюць 100 мільёнаў злотых дапамогі на інвестыцыі, якія будуць садзейнічаць лепшай ахове асяроддзя. У гэтай суме 90 мільёнаў злотых маюць састаўляць датацыі з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі, 10 мільёнаў злотых можна будзе атрымаць у выглядзе пазык пад нізкія працэнты. Гэтыя грошы можна будзе інвеставаць у інфраструктуру, адукацыю і турызм.

— Мы рыхтуем пакет праектаў, якія, між іншым, тычацца гаспадаркі сцёкамі. Будуць грошы на ўспамажэнне ашчаднасці энергіі шляхам тэрмамадэрнізацыі будынкаў, ці фінансаванне энергаашчаднага асвятлення вуліц. Гэта, між іншым, абмяжуе забруджванне асяроддзя ў ходзе абагравання дамоў, якое часткова стане незалежным ад драўніны. Трэба таксама памяняць гаспадарку адкідамі. У Гайнаўцы будзе адбывацца сартаванне адкідаў і мы ўжо прызначылі на сартавальню 20 мільёнаў злотых. Гэтыя інвестыцыі спрычыняцца да стварэння новых месц працы, а без іх не можа развівацца турыстычная прамысловасць, — сказаў міністр асяроддзя Мацей Навіцкі.

— Гэта пэўныя грошы і ўжо падрыхтаваныя, — гаварыў старшыня Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі Ян Рончка.

— Прыміце наш праект, як сур'ёзную прапанову, дзе ёсць яшчэ магчымасць размаўляць і ўзаемна ўступаць, — заявіў у Белавежы міністр Мацей Навіцкі.

Прыехаўшы ў Белавежу, міністр Навіцкі пачаў гаварыць аб дадатковых 100 мільёнах злотых на пушчанскія і прыпушчанскія інвестыцыі. Паводле міністра да раней прапанаваных 100 мільёнаў злотых трэба далічыць яшчэ 11 мільёнаў прызначаных у швейцарскіх франках на ўзнаўленне мясцовай чыгункі між Гайнаўкай і Белавежай, 20 мільёнаў надзеленых на рамонт ваяводскай дарогі з Гайнаўкі ў Навасады і чарговыя 20 мільёнаў злотых, якія можна будзе атрымаць на будову Прадпрыемства ўтылізацыі адкідаў у Гайнаўцы побач Прадпрыемства сартавання смецця. Да гэтага дайшла б яшчэ пабудова спартыўных пляцовак у рамках агульнапольскай праграмы „Орлік".

— Мы размаўляем таксама пра газіфікацыю Гайнаўскага павета, але ў гэтай справе патрэбна згода Расіі і Беларусі, падчас міжурадавых размоў, — сказаў міністр Мацей Навіцкі (разглядаецца магчымасць падключэння да міжнароднага газаправода трубы, якой газ паплыў бы ў гміны Гайнаўскага павета).

Прывезеныя ў Белавежу прапановы покі не задавальняюць мясцовых самаўрадаўцаў. Гайнаўскі стараста Уладзімір Пятрочук заявіў, што трэба шукаць кампрамісу паміж патрэбамі аховы асяроддзя і цывілізацыйнага развіцця рэгіёна. Стараста выказаў надзею, што сустрэча ў Белавежы гэта пачатак працэсу ў справе пашырэння парку і спадзяецца, што стане ён таксама пачаткам дыялогу на тэму дадатковых праграм для мясцовага насельніцтва.

— Важнае, ці Міністэрства асяроддзя запрапануе нашай гміне кампенсацыю за страчаны намі падаткавы прыбытак, бо мусім памятаць, што лясны падатак складае заўважальную частку гмінных даходаў (калі пушча стане часткай нацыянальнага парку, падатак будзе намнога ніжэйшы, чым зараз, калі належыць яна да Дзяржаўных лясоў). Мусім таксама ведаць ці пушчанская ахоўная зона не будзе ўваходзіць нам на жыллёвыя будынкі. Парк будзе пашыраны і міністэрства ставіць нас перад рашэннем, якое можа быць прынята. Аднак абяцаныя сродкі — гэта еўрасаюзныя датацыі, за якіх атрыманне мы будзем мусілі хадайнічаць і няма пэўнасці, што мы іх атрымаем. Я лічу, што спачатку трэба нам паказаць, што можам карыстацца абяцанымі грашамі, а пазней пашырайма парк, — сказаў войт Белавежскай гміны Альберт Літвіновіч.

Іншыя самаўрадаўцы з Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" разлічваюць на сродкі як на дарожныя інвестыцыі, так і на будову газавай сеткі на тэрыторыі мясцовых гмін.

Генеральны дырэктар Дзяржаўных лясоў Марыян Піган разлічвае, што пасля ліквідацыі Белавежскага і абмежавання дзейнасці Броўскага надлясніцтва ў можа ў іх і ў лясным паслуговым сектары страціць працу больш за 140 чалавек, але частка з гэтых людзей можа знайсці занятак у Белавежскім нацыянальным парку і прадпрыемствах, якія будуць аказваць паслугі парку. Хаця парк не будзе пашыраны на іншыя гміны (апрача Белавежскай і Нараўчанскай), можа крануць прадпрымальнікаў і работнікаў мясцовай дрэваапрацоўчай прамысловасці, бо Белавежская пушча будзе пастаўляць менш драўніны. Большыя прадпрыемствы будуць завозіць драўніну з іншых лясоў, а нават з замежжа, як рабілі і да гэтай пары, але меншым можа быць цяжка стрымаць канкурэнцыю і плаціць за транспарт драўніны з аддаленых месц, калі яе не хопіць з тэрыторыі, якой надалей будуць уладаць Дзяржаўныя лясы. Аднак прадбачваецца, што на тэрыторыі павялічанага Белавежскага нацыянальнага парку можна будзе збіраць грыбы і ягады.

Цяпер намечаны чарговыя размовы паміж самаўрадаўцамі і прадстаўнікамі ўрада ў справе магчымасцей выкарыстання прапанаванай дапамогі, як і атрымання дадатковых сродкаў на інвестыцыі, на якіх найбольш залежыць самаўрадаўцам. Калі радныя Белавежскай і Нараўчанскай гмін рашацца даць згоду на пашырэнне Белавежскага нацыянальнага парку, павінны гэта зрабіць да канца жніўня (непатрэбная зараз згода іншых самаўрадаў). Ужо ў верасні можа быць прынята рашэнне аб пашырэнні Белавежскага нацыянальнага парку. Калі б нашы радныя прынялі адмоўнае рашэнне, існуе магчымасць пашырэння існуючых запаведнікаў прыроды і стварэння новых у рамках святкавання 600 гадавіны аховы Белавежскай пушчы (лічыцца яна з палявання ў ёй караля Ягайлы ў 1409 годзе). У запаведніках рэжым аховы яшчэ больш строгі, чым у парках, а для іх стварэння і пабольшання непатрэбная згода мясцовых самаўрадў. Аднак прыхільнікі ідэі пашырэння парку спадзяюцца, што нейкі кампраміс, пасля ўступак з абодвух бакоў, будзе дасягнуты. Ужо зараз самаўрадаўцы Гайнаўскага павета выступілі з заклікам да Міністра рэгіянальнага развіцця, падляшскага ваяводы, управы Падляшскага сейміка, каб у планы гэтых устаноў увесці праекты, якія пашырылі б прапановы Белавежскай праграмы развіцця, у рамках якой у Гайнаўскі павет можа быць накіравана фінансавая дапамога. Праекты гэтыя маглі б быць прафінансаваны з урадавых і еўрасаюзных праграм, напрыклад, з „Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы Падляшскага ваяводства", праграм „Інфраструктура і асяроддзе", „Людскі капітал" ці „Праграмы развіцця вясковых тэрыторый".

— Мы гатовы падрыхтаваць адпаведныя аплікацыі, але патрабуем дапамогі ад распарадчыкаў фондаў. Для рэалізацыі ініцыятыў у галінах мадэрнізацыі ваяводскіх дарог, аднаўлення чыгункі на лініі Гайнаўка — Белавежа, ці ў справе будовы газавай сеткі патрэбны адпаведныя рашэнні ўправы Падляшскага сейміка, — пішуць у адозве нашы самаўрадаўцы. — Сённяшнюю прапанову лічым пачаткам дыялогу. Верым, што давядзе яна да сапраўднага кампрамісу паміж патрэбамі аховы пушчанскай прыроды і цывілізацыйнымі патрабаваннямі жыхароў рэгіёна Белавежскай пушчы.

З рукой на сэрцы

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Калі прапанавала я сакольскай і маладзечанскай моладзі вандроўку па занядбаных беластоцкіх месцах, звязаных з Янам Тарасевічам, не чакала іх асаблівай увагі да жорсткай трактоўкі беларускай культуры...

Вандроўку пачалі мы з рэдакцыі „Нівы", дзе, між іншым, прапанавалі гасцям (у падарак) беларускую кніжку „З Беластоцкай зямлі":

— A czy my też możemy? — спытала ліцэістка з Саколкі.

— А прачытаеш па-беларуску?

— Пэўна, што прачытаю! А як будуць сумненні, бацькі дапамогуць... — адказала. Падобнага меркавання былі сакольскія сябры-ліцэісты. Яшчэ раней, калі мы вырашалі пытанне мовы, яны пажадалі:

— Niech pani mówi po białorusku, my wszystko rozumiemy...

Праўда, мы сустрэліся ў восьмы дзень польска-беларускіх майстар-класаў і, як яны самі гаварылі, моўны бар'ер быў ужо пераадолены. І, здаецца, не толькі моўны бар'ер.

Пажаданая пры ўсялякіх праектах г.зв. інтэграцыя тут выспявала на вачах. Між маладымі завязаліся сяброўствы і першыя каханні. І каб не бэджыкі з імёнамі і прозвішчамі на грудзях у гасцей з Маладзечна, я не ўмела б па адным выглядзе адрозніць маладых беларусаў і палякаў...

Вандроўку шляхам Яна Тарасевіча мы пачалі ад канца, значыць, ад вуліцы Бэма 6, дзе 18 чэрвеня 1961 года памёр кампазітар. Тут напісаў ён самую значную колькасць твораў, аднавіў загінулыя ў пажарышчах вайны рукапісы.

Часам не трэба слоў, каб перадаць самае важнае. Месца баліць занядбаннем. Сярод дзікіх кустоў і пустазелля хтосьці заўважыў стары, выкінуты на сметнік, фатэль. Моладзь, якая мела нагоду сутыкнуцца з музыкай кампазітара, не ведала як аднайсці сябе ў такой сітуацыі. Многія з іх ад шоку круцілі галавой, нехта застыў на момант з рукой на сэрцы, хтось узіраўся ў імжыстае неба, чакаючы адтуль адказу. Паўсюдна гучала пытанне: як гэта магчыма?

У той дзень, калі ад інфаркту памёр музыкант, пакліканы голасам душы, пад вечар, з'явіўся з Варшавы Юрка Максымюк. Ад хвалявання ён сам адзін праседзеў усю ноч ля нябожчыка, іграючы яму любімыя творы Бетховена, Рахманінава, Ліста... Часам, калі прыходжу на сумны панадворак кампазітара, амаль фізічна адчуваю гэтую кранальную карціну развітання. І на яго апошняй дарозе на могілкі ў Саколку з'явіліся толькі выхаванцы з Варшавы і Любліна.

Бо праўда тут такая — Беласток не прыкмеціў смерці кампазітара. Яго яшчэ пры жыцці тут затапталі ў зямлю...

Мы мелі шчасце ісці па старых фрагментах брукаванай вуліцы, дзе ў канцы саракавых, па адрасе Жэлязна 48, у гэтак званай летняй кухні жыў музыкант. Хатка не існуе, яе знеслі пад жыллёвы блёк. Як успаміналі мне яго тагачасныя вучні, месца ўражвала вялікай беднасцю (To była jakaś kurna chata? A przecież z pałaców wyszedł!). Гэтая карціна бударажыла тадышніх гасцей з Саколкі, якія памяталі музыканта-шляхціца з даваенных, лепшых часоў. У гэтым месцы была добрая нагода прыгадаць двор у Шындзелі, дэталёвае апісанне якога ведаем ад Эдварда Шчасновіча, які ў 1932-1934 гадах служыў там парабкам. Двор складаўся з дзвюх частак, у адной з іх жыў музыкант, тут даваў лекцыі музыкі вучням з навакольных маёнткаў і Саколкі. Другая частка была адведзена службе і аканомам. Дзень да нашай сустрэчы сакольска-маладзечанская моладзь наведала Шындзель. На месцы, дзе жыў і працаваў музыкант, таксама ўсе сляды затаптаныя...

Некаторыя фрагменты вуліцы Жалезнай літаральна жалезныя, яны палохаюць іржава-жалезнымі буданамі-гаражамі, абшмаранымі свастыкамі і падобнымі „кветкамі".

Добра, што ў рэшце рэшт папалі мы ў прыгожы парк Звярынец — любімае месца прагулак Яна Тарасевіча і яго вучняў. Прыходзілі сюды амаль кожны дзень. Музыкант, па дарозе, апавядаў пра гісторыю Расіі, якую ведаў як сваю кішэнь. Пра тое, як ён сам выпадкова стаў сведкам славутай атакі на Зімовы палац у 1917 годзе. У сапраўднасці падзея не выглядала страшна, хутчэй чым гераічны акт яна напамінала рабунак. Успамін штодзённых вандровак па Звярынецкім парку вярнуўся пасля гадоў у творчасці Ежы Максымюка, які ў 2002 годзе прысвяціў свайму майстру сімфонію „Арбор" („Дрэва"). Кампазіцыю заказала Радыё Беласток на свой залаты юбілей...

На канец нашай вандроўкі мы папалі на вуліцу Шчыглю 7. Ля ўцалелага будынка была добрая нагода ўспомніць Анатоля Чарапінскага. Вучань і прыяцель музыканта ў 1993 годзе перадаў першыя копіі твораў у Мінск і тым самым запачаткаваў вяртанне імя Яна Тарасевіча ў нацыянальную спадчыну. Калі ў 1947 годзе Ян Тарасевіч быў вымушаны пакінуць Саколку, ён спачатку спыніўся якраз у доме свайго вучня і прыяцеля. Тут меў магчымасць дакрануцца да фартэпіяна, без якога, — як казаў пан Анатоль, — хадзіў як не свой... Сёння ў доме па вуліцы Шчыгляй жывуць бяздомныя людзі. Яшчэ пры жыцці Анатоль Чарапінскі прыязджаў з Любліна, каб заплаціць за іх за электраэнергію. Дом уцалеў, бо гаспадар не меў сумлення выкінуць сваіх клапатлівых кватарантаў на вуліцу...

Таму мы мелі нагоду сфатаграфавацца на фоне адзінага ўцалелага дома, у якім жыў Ян Тарасевіч. Будынак, што прыкмеціла моладзь, аздабляе размаляваная ўручную сямёрка. Фатаграфіі з нашага падарожжа апынуліся ў фотагалерэі на сайце, прысвечаным музыканту: www.jantarasiewicz.org

Пасля, калі ў Сакольскім старастве падводзілі вынікі праекта, на які горад атрымаў ажно 12 тысяч еўра, нечакана я пачула словы падзякі ў адрас нашай рэдакцыі (якая адзіная патранавала праекту):

— Сустрэчу з рэдакцыяй „Нівы" і вандроўку па сумных месцах, звязаных з кампазітарам, мы ўспамінаем як самыя светлыя моманты нашага праекта, — сказала Тацяна Бабей, рэжысёр-пастаноўшчык п'есы „На крыллях музыкі", прысвечанай музыканту з Шындзеля. Адчуваючы зразуменне для складанасці беларуска-польскай спадчыны, я напомніла пра занядбаную магілу Яна Тарасевіча. Бо як выглядаюць усе нашы прыгожыя гутаркі пра музыку і мастацтва ў сітуацыі, калі магіла першага музыканта выглядае як самая апошняя на могілках... Да таго з табліцай з памылкамі.

Тым больш, што горад занёс магілу музыканта ў лік турыстычных атракцыёнаў Сакольшчыны!

18.06.2009 г. Саколка, настаўніца Ірэна Шыманюк, Віталь Луба і Міра Лукша на вуліцы Яна Тарасевіча

24.06.2009 г. Беласток, удзельнікі праекта „Ян Тарасевіч вядомы і невядомы кампазітар памежжа" ля адзінага ўцалелага дома, па вуліцы Шчыгля 7, дзе жыў музыкант

А можа так паплывем некуды!

Фота ЯНА ТАМІЛІНА

Фота ЯНА ТАМІЛІНА

Так марыў Міхась Куптэль, арганізатар традыцыйных турыстычных вандровак беларусаў Узбярэжжа ў свята каталіцкага Божага Цела, думаючы пра сёлетнюю вандроўку. Але ўзяў ды з'ехаў на доўгі чэрвеньскі ўік-энд на родную Беласточчыну. Ды не толькі адзін Міхась. Нашы пастаянныя вандроўнікі неяк у гэтым годзе кінуліся на бацькаўшчыну, маючы перад сабой чатыры дні адпачынку. Тыя, што асталіся над берагам Балтыйскага мора, вырашылі яго перамераць спярша плывучы водным трамваем, а пасля вандруючы Гэльскай касой, вядома, ад стараны сапраўднага мора. Бо нам, жывучым над морам, Гданьскі заліў — гэта не мора. Выбралі мы напрамак Гданьск — Гэль. Як на святочны дзень рана, бо ў 8 гадзін, трэба было сабрацца над Матлавай, побач вежы „Лебедзь". У 8.30 адплываў водны трамвай на Гэль. Ахвотных і тых, якія не праспалі, у чацвер 11 чэрвеня сабралася 7 асоб: ветэраны нашых вандровак — Алесь Юзафовіч, Чэсь Мекін, Павал Аўласюк, Павал Юрэц, студэнт Ян Тамілін з сяброўкай Кацяй ды аўтарка гэтых слоў. Нягледзячы на ранак і свята, сабраўся немалы натоўп людзей, жадаючых паплыць водным трамваем на Гэль. Надвор'е было цёплае і сонечнае. Выплываючы па Матлаве ў Гданьскі заліў, мінулі мы крэпасць Віславусце ды набярэжную Гданьскай суднаверфі і порта з караблямі і кранамі. У мінулым годзе стаяў там карабель „Белоруссия" з Пецярбурга. Зараз, на жаль, яго не было. Выплыўшы на воды Гданьскага заліва можна захапляцца ўсім Трыгарадам. Дзве гадзіны ў марскім трамваі праходзяць вокамгненна. За намі прыплыў водны трамвай з Гдыні — ім мелі даплысьці студэнты Надзея і Рома. Але не паспелі і ехалі ў Гэль цягнікам.

Спярша наведалі мы акіянарыум з цюленямі — адзін з галоўных атракцыёнаў Гэля. Каб паназіраць за цюленямі, якія належаць Марской станцыі Інстытута акеанаграфіі Гданьскага ўніверсітэта, трэба за ўваход заплаціць сімвалічнае 2 зл. Мы мелі шчасце — папалі якраз на кармленне гэтых марскіх жывотных. Кармілі іх рыбай. Цікава было назіраць іх паслухмянасць, каб толькі атрымаць рыбку. Тыя, якія не слухаліся, не атрымлівалі рыбкі, а тыя найбольш паслухмяныя — атрымлівалі дадатковую рыбку ва ўзнагароду. Зараз у басейне 6 цюленяў — 2 самцы (Бубас і Фок) і 4 самкі (Унда, Агата, Аня і Эва). Вельмі цікава назіраць іхняе воднае жыццё, што ажно цяжка было адарваць вочы. Але ўсё ж такі мы прыплылі, каб прайсціся берагам сапраўднага мора. Можна зараз абысці закруглены канец паўвыспы, якая некалі была недаступная для турыстаў. Сама памятаю, як нелегальна яго абышла можа 10 гадоў таму. Зараз — калі ласка — рэкамендуюць яго як пачатак Польшчы. Але мы вырашылі ісці ў напрамку Юраты — насустрач ішлі нам Надзея з Ромам, якія ў Юраце сышлі з цягніка. Адлегласць аказалася немалая — сама меней 12 кіламетраў. Вырашылі затрымацца і чакаць моладзь, падсілкуючыся печанымі на вогнішчы каўбаскамі. Раптам пачала насоўвацца вялізная чорная хмара. Ледзь паспелі скрыцца ў нейкім выпадковым былым вайсковым сховішчы, якое абараніла нас ад ліўню. Апынуліся мы ў вайсковай зоне. Дарэчы, ваеннае і вайсковае мінулае Гэльскай касы гэта таксама атракцыён для тых, якія цікавяцца прадметамі ваенных часоў. Правандраваўшы ўвесь дзень, хацелася яшчэ раз паплыць марскім трамваем у Гдыню. На жаль, усе білеты былі распрададзены. Аставаўся цягнік або аўтобус. Выбралі цягнік, які імкнуўся па рэйках уздоўж Гэльскай касы, якая доўжыцца на 35 кіламетраў. І тут назіралі мы цікавыя вобразы. Вось у некаторых месцах бачыш мора па абодвух баках цягніка — сапраўднае Міжмор'е, як назваў паўвыспу Стэфан Жаромскі.

Гэльская каса павінна прыцягнуць турысаў, асабліва горад Гэль — так там усё памянялася ў лепшы бок на працягу апошніх дзесяці гадоў.

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Зразумець душу кожнага народа немагчыма без азнаямлення з яго літаратурнай спадчынай. І беларускі народ тут не выключэнне. Нягледзячы на дзесяцігоддзі павольнага выкаранення беларускай мовы і сённяшняга грэблівага стаўлення да яе, у Беларусі існуе пэўная колькасць літаратурных музеяў, якія сваім існаваннем выконваюць вельмі важную функцыю — не дазваляюць беларусам канчаткова забыцца пра свае карані. У большай ступені гэта тычыцца Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, на сайт якога варта завітаць.

Віртуальнае прадстаўніцтва музея месціцца па адрасе http://litmuseums.iatp.by/litm/by. Выяўленне мае шмат агульнага з раней апісаных на старонках „Нівы" сайтаў музеяў Багдановіча, Коласа і Купалы. Яны і аб'яднаныя адной назвай — „Літаратурныя музеі Беларусі". Праўда, музей гісторыі наймаладзейшы з усіх. Ён быў створаны ў 1987 годзе, калі хвалі перабудовы крыху абудзілі ў саветызаваным насельніцтве Беларусі прагу да нацыянальнай гісторыі і культуры.

„Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры — гэта адзін з буйнейшых літаратурных музеяў краіны і адзіны літаратурны музей, які займаецца дакументаваннем літаратурнага працэсу на Беларусі ў шырокім гістарычным кантэксце: ад часоў узнікнення пісьменства да сённяшніх дзён, — распавядаецца на першай старонцы сайта. — Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры — гэта фонд унікальных калекцый рукапісаў, рэдкіх кніг, фотаздымкаў, твораў мастацтва, асабістых (мемарыяльных) рэчаў і дакументаў беларускіх пісьменнікаў".

Музей знаходзіцца ў гістарычным кутку Мінска — Траецкім прадмесці. Усяго ў ім утрымліваецца 38 тысяч адзінак музейных прадметаў.

Адной з каштоўных асаблівасцей музея гісторыі літаратуры з'яўляюцца пяць ягоных філіялаў, што раскіданыя па іншых кутках Беларусі. Гэта — музей-сядзіба Міцкевічаў у Завоссі на Брэстчыне; літаратурны музей Кузьмы Чорнага ў вёсцы Цімкавічы Мінскай вобласці; музей-сядзіба Францішка Багушэвіча „Кушляны" ў аднайменнай вёсцы на Смаргоншчыне; гісторыка-літаратурны музей у вёсцы Гарадок непадалёк Маладзечна на Міншчыне, а таксама літаратурны музей Максіма Гарэцкага ў Малой Багацькаўцы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Кожны філіял, адпаведна, мае ўласную старонку на сайце, што дазваляе дэтальна пазнаёміцца з іхнімі экспазіцыямі. Хаця, канешне, рэальнае знаёмства з музейнымі экспанатамі лепшае за віртуальнае.

Музей гісторыі літаратуры прапануе і разнастайныя тэматычныя выставы, якія могуць мець часовы характар. Інфармацыя аб іх месціцца ў рубрыцы „Выставы". Так, у даны момант там экспануецца літаратурна-дакументальная выстава „Покліч", што распавядае як адбіліся трагічныя 20-30 гады мінулага стагоддзя на беларускай літаратуры. Дзецям прапануецца знаёмства з гісторыяй буквара, а зацікаўленым у вывучэнні гісторыі і традыцый роднай зямлі адрасавана выстава „Хата — мой сусвет", якая пазнаёміць з абраднасцю і песенна-лірычнай спадчынай беларусаў.

Супрацоўнікі музея ладзяць музейна-педагагічныя заняткі ў школах. Таксама яны праводзяць лекцыі, дзе сярод іншага распавядаюць пра беларускую міфалогію, літаратуру эпохі Рэнесансу, пра жыццё і творчасць Васіля Быкава.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Калектывісцкі чэрвень

Так сталася, што камандавых спаборніцтваў у чэрвені было куды болей, чым індывідуальных. Расчаравалі нацыянальныя зборныя па гандболе. Мужчыны, з трэскам прайграўшы Славеніі, не выйшлі з групы ў фінал кантынентальнага спабору. На жаль, і беларускія гандбалісткі не здолелі прабіцца ў фінальную стадыю чэмпіянату свету. У кваліфікацыйным змаганні нашы дзяўчаты ў гасцях саступілі камандзе Румыніі — 32:38. Першы матч у Магілёве таксама завяршыўся паразай — 31:32. Камандай месяца можна назваць баскетбольную жаночую дружыну, якая заняла 4-е месца на еўрапейскім першынстве і заваявала пуцёўку на чэмпіянат свету.

У мужчын варта адзначыць наваполацкі „Нафтан", які ўпершыню ў сваёй гісторыі заваяваў Кубак Беларусі па футболе. Юныя беларускія футбалісты ва ўзросце да 17 гадоў выйгралі Кубак Малдоўскай Федэрацыі. Пацвердзілі сваё высокае рэнамэ дзесяціборцы, якія сталі другімі ў Суперлізе Кубка Еўропы. Бейсбольная каманда „Брэсцкія зубры" заняла чацвёртае месца ў кваліфікацыі Кубка Еўропы, што прайшоў у чэшскай Астраве. Дасягнула поспеху ў лёгкай атлетыцы беларуская аб'яднаная каманда, якая па выніках чэмпіянату Еўропы ў першай лізе стала мацнейшай і здабыла месца ў суперлізе. Беларускія дзюдаісты сталі трэцімі ў медальным заліку на этапе так званага Вялікага шлема, што прайшоў у Маскве. Беларускі квартэт байдарачнікаў выйграў чэмпіянат Еўропы, а чацвёрка канаістаў стала „бронзавай".

А далей коратка прадстаўляем індывідуальныя дасягненні.

1. Наталля Міхневіч (штурханне ядра) заняла 2-е месца на вельмі прэстыжным стартавым этапе так званай „Залатой лігі". Спаборніцтвы праходзілі ў сталіцы Нямеччыны Берліне.

2. Тацяна Драздоўская (ветразевы спорт) выйграла этап Кубка свету, які прайшоў у Нідэрландах у горадзе Медэмблік. Чэмпіёнка свету 2007 года перамагла ў класе „Лазер-радыял".

3. Алена Леўчанка (баскетбол) была сапраўдным лідарам зборнай і мела лепшыя індывідуальныя паказчыкі сярод беларусак — 10,6 ачка за матч і 9,2 за падборы.

4. Святлана Хахлова (плаванне) на адкрытым першынстве краіны ўсталявала новы рэкорд Беларусі на дыстанцыі 50 метраў батэрфляем. Новае дасягненне цяпер складае 26,48 секунды.

1. Андрэй Краўчанка (дзесяцібор'е) не меў сабе роўных на Суперлізе Кубка Еўропы і пераканаўча першынстваваў.

2. Аляксандр Царэвіч (спартовая гімнастыка) на этапе Кубка свету, што прайшоў у Маскве, стаў бронзавым прызёрам у практыкаванні на папярэчыне, а на брусах паказаў чацвёрты вынік.

3. Андрэй Міхневіч (штурханне ядра) выйграў прэстыжны міжнародны турнір, які прайшоў у іспанскім горадзе Малага. У лепшай спробе ён паказаў вынік 20,81 метра.

4. Аляксандр Усцінаў — беларускі баксёр-суперцяжкавагавік, які валодае тытулам чэмпіёна Еўропы па версіі EBA, атрымаў чарговую перамогу на профі-рынгу. У нямецкім Гёльзенкірхене ён сустрэўся ў нетытульным паядынку з брытанцам Майклам Шпротам і перамог паводле аднагалоснага рашэння суддзяў.

5. Сяргей Шундзікаў (дзюдо) у Маскве ў катэгорыі да 81 кілаграма ў фінале адолеў суайчынніка Аляксандра Сташэнку.

5. Андрэй Казусёнак (дзюдо) у вазе да 90 кілаграмаў стаў сярэбраным прызёрам, саступіўшы толькі японцу Такашы Она.

6. Казімір Фіцнер (цяжкая атлетыка) у Бухарэсце на юніёрскім першынстве свету ў вагавай катэгорыі да 77 кг здабыў золата, паказаўшы у двухбор'і вынік 334 кілаграмы.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Кастусю — памятны камень

На адкрыцці Дома культуры ў Гарадку. На бюст Кастуся Каліноўскага загледжаны Лідка Дзмітрук і Анна Жукоўская, „Ніва" н-р 27 (540) ад 3.07.1966 г.

Прачытаў я быў у „Ніве" артыкул пад загалоўкам „Каліноўскі — нязручны герой". Хочацца сказаць мне тое, што пра Кастуся Каліноўскага ведаю ад сваіх продкаў. Напісана пра Каліноўскіх шмат, асабліва пра Кастуся, але, на маю думку, поўнай праўды ніхто не сказаў. Што Кастусь Каліноўскі беларускі герой, сумнення няма ніякага. Думаю, трэба ведаць, якія Каліноўскія былі ў рэчаіснасці. З расказаў маёй бабці, а мама яе працавала ў Каліноўскіх некалькі гадоў, вядома, што Кастусь Каліноўскі ўважаў сябе за беларуса, але вера праваслаўная яму не адпавядала. Лічыў, што беларусы будуць толькі тады шчаслівымі, калі адыдуць ад праваслаўя і ад Расіі, а прыхіляцца да Польшчы. Пацвярджаў гэта Арсеній Гарадкевіч, якога продкі працавалі ў маёнтку Каліноўскіх усё сваё жыццё, а таксама іншыя жыхары Мастаўлян. У хаце Каліноўскіх гаварылі толькі па-руску, а калі прыязджалі якія-небудзь госці, дык гаварылі таксама па-руску і вельмі нячыста часам па-польску. Па-беларуску ніколі размовы там ніхто не чуў, а часта насмейваліся з тых, хто верыць у Бога па-маскоўску. У маёнтку вельмі зычліва прымалі дзяцей вучыць каталіцкай малітвы. Мая бабця Марыя навучылася па-польску „Ojcze nasz". А Кастуся памятала як прыгожага, шустрага „младзенца", вельмі гаварлівага.

Паўстанне 1863 г. добра памятаў мой дзед Аляксей Парэмбскі, які ў той час быў немалым падросткам, а жыў у Страшаве. Ва ўрочышчы Дубова, паміж вёскамі Страшава і Белявічы скрывалася група паўстанцаў, якія ў аднаго селяніна ў Страшаве забралі двое коней. Мужыкі ўзброіліся ў вілы і сякеры, адабралі коней, а паўстанцаў патузалі. Гэтых паўстанцаў ад таго, што адымалі ў сялян маёмасць, называлі бандай, а Дубова, дзе хаваліся паўстанцы, сталі называць „Паляцкі Грудок", бо гэтыя паўстанцы гаварылі толькі па-польску. Пасля гэтага здарэння паўстанцы выйшлі з Дубова, гаварылі, што пайшлі ў Шацілы, скуль быў родам, казалі, іхні камандзір. Па правіянт паўстанцы з Дубова ездзілі ў маёнтак Каліноўскіх дарогай якую называлі „копанкай".

Пра „Мужыцкую праўду" дзед Аляксей штосьці ўспамінаў. Вядома, што яна мела памагчы Кастусю схіліць беларускае насельніцтва на яго бок. Але гэта было немагчыма, бо мужыкі ведалі, што гэта паўстанне не беларускае, а польскіх паноў (уладальнікаў зямлі). Беларусы ведалі, што дала ім унія з Каронай. Збліжэнне з Расіяй астаўляла хоць веру.

Мы, беларусы, маем герояў Міцкевіча, Касцюшку, стаяць ім помнікі ў Беларусі. Думаю, што Кастусь Каліноўскі, які загінуў у барацьбе за беларускую долю, варты болей ад усіх. Пакласці яму памятны камень у Мастаўлянах трэба. Але гэтага замала.

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Дурноце няма меры

У апошні час Польская тэлекамунікацыя АС пачала штосьці вычвараць са сваімі кліентамі. То рахункаў на час не даслалі і людзі званілі з рэкламацыяй ды прасілі прадоўжыць тэрмін сплат або самі выпісвалі бланкі і хадзілі плаціць, не чакаючы рахунку. Мала таго, некаторым рахункі прыносілі пісьманосцы, а іншым кур'еры, і гэтыя апошнія да рахункаў далучалі тоўстую кардонку. У чэрвені г.г. замест кардонкі да рахункаў былі далучаны металёвыя бляшкі, на якіх было вырыта *In Post usługi pocztowe.* Вага гэтага разам з жалезівам налічвала 49 грамаў. Жыхары горада Бельска кажуць, што чулі, калі вага пісьма да 50 грамаў, ліст носіць пісьманосец, а каб даць зарабіць іншым канкурэнтам пошты, вага павінна перавысіць 50 грамаў, і таму чапляюць то кардонкі, то бляшкі. Ці падумае хто, што гэтыя дадаткі да нічога не прыдаюцца. Падумайце, колькі з-за такой дурноты змарнуецца дрэў, а колькі сшыткаў для дзяцей за гэта было б, а за тую бляху можна паладзіць дзіравыя дахі хатаў ці іншых будынкаў. Вось да чаго даходзіць у нашай краіне, якія мы гаспадарлівыя! Бюджэтную дзірку нам ніколі не залатаць! Тэлефонаў у людзей шмат, і такая сітуацыя выклікае смех і злосць. І што на гэта ТП АС, з вуліцы Твардай, 18, 00-105 Варшава? А адрас на ліставанне ў гэтай фірмы: вуліца Бажантаў, 35, 40-668 Катавіцы?

Жэня МАРТЫНЮК

Мегапоспех новага альбома Вольгі Казак

15 траўня зала сабора св. Кірылы Тураўскага ў Нью-Йорку адчыніла свае дзверы прыхільнікам вялікага таленту беларускай спявачкі, аўтара, выканаўцы, прадзюсара Вольгі Казак (OLYIA). Праграма паўтарагадзіннага канцэрта ўключала песні з новага сольнага англамоўнага CD спявачкі і ўжо вядомыя сінглы ў яе выкананні.

У незабыўным шоў таксама прымалі ўдзел таленавітыя танцоры, спевакі, пераможца Academy Award і прызёр Grammy спявак і прадзюсар Чарльз Мэк і дзі-джэй Брыз Джэннінгс. Вядучая шоў, вядомая выканаўца і камедыянт з Нью-Йорка Марыса Вураль падтрымлівала добры настрой на працягу ўсяго вечара.

Прыхільнікі новага таленту пачулі песні Вольгі Казак з яе першага сольнага альбома. Яна таксама з'яўляецца і іх аўтарам. Апошні нумар „I'm Good" прагучаў у выкананні Волі, Kyree і NJ5 з топ-поп групы MTV. Ну а спецыяльна для беларускіх прыхільнікаў Воля разам са сваімі бацькамі праспявала ўжо добра вядомую песню „Белая".

Сольны альбом Волі, які выйдзе ў бягучым годзе ў ЗША, будзе вялікім поспехам!

Падрабязную інфармацыю пра Волю Казак і яе музычны альбом шукайце на www.myspace.com/olyiamusic ці www.globalbeatent.com .

Прэсс рэліз Global Beat Entertainment

Адгаданка

1. горад на Нёмане між Слонімам і Гроднам, 2. чалавек, які мысліць догмамі, 3. турэцкі пехацінец-карнік, 4. літаратурнае прозвішча Людвіка Кандратовіча, польскага і беларускага паэта, 5. поезд, 6. вялікі японскі порт на паўночным захадзе выспы Кюсю, 7. рухавік унутранага згарання з запальваннем ад высокага ціску, 8. міфічны лётчык, 9. рэлігійная забарона.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — валійская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

1										
									2	
				3	4		5			
			6					7		
			8		9					

Адказ на адгаданку з 22 нумара

Зюзя, коўш, мача, поле, пума, цыган, цынк.

Рашэнне: **Лепш пакаўзнуцца нагою чым языком.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Галене Тапалянскай** з Трасцянкі і **Міхалу Байко** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Трэцяя Нацыянальная

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Больш за сто прадпрыемстваў з усіх рэгіёнаў удзельнічала ў двухдзённай Нацыянальнай выстаўцы Беларусі ў варшаўскай спартыўнай зале „Торвар". Гэта была ўжо трэцяя такога тыпу прэзентацыя ў Польшчы. Папярэднія праводзіліся чатыры і два гады таму. Сёлета адкрылі яе асабіста віцэ-прэм'еры абедзвюх краін: Андрэй Кабякоў і Вальдэмар Паўляк і спадарожнічала яна І Польска-Беларускаму эканамічнаму саміту.

Са сваімі прапановамі з'явіліся м.інш. прадстаўнікі аўтатрактарнай, хімічнай, нафтаперапрацоўчай, энергетычнай, прадуктовай прамысловасцей, банкаў, будаўніцтва, мэблевай прамысловасці, фінансавых і турыстычных устаноў ды навукова-даследчыцкіх арганізацый. Праводзіліся семінары датычныя банкаўскай справы і інвестыцый, турызму ды хімічнай і паліўнай прамысловасцей. У рамках гэтай апошняй рэкамендавалася „Беларуская нафтавая кампанія" ў Польшчы.



— Узрастае ўзровень польскіх інвестыцый у Беларусі, дынамічна развіваецца паслуговы сектар, — адзначыў у час адкрыцця выстаўкі віцэ-прэм'ер Кабякоў. — Гэтая выстаўка мае на мэце стаць чарговым імпульсам у развіцці беларуска-польскага супрацоўніцтва ў галіне гандлю, энергетыкі, сучасных тэхналогій ды спрычыніцца да развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Адзначыў прытым:

— Польшча і Беларусь маюць агромны патэнцыял у развіцці транспарту, транзіту энергетыкі і турызму. Паспяховасць нашага двухбаковага супрацоўніцтва залежыць у вялікай ступені ад супольных дзеянняў і інтэнсіўнасці нашага дыялогу.

У сваю чаргу віцэ-прэм'ер Вальдэмар Паўляк сказаў:

— На нашу думку, вельмі важным з'яўляецца стварэнне як найбольшых магчымасцей непасрэдных кантактаў паміж прадпрымальнікамі.

Летась больш за 5 200 польскіх прадпрымальнікаў удзельнічалі ў гандлёвым абмене з Беларуссю. Польскі экспарт, незалежна ад крызісу, калі пералічым яго на залатоўкі, узрастае, ды калі пералічым на долары — паменшаў на каля 20 працэнтаў.

Пасол РБ у Польшчы Віктар Гайсёнак сказаў:

— Мы задаволены гэтай выстаўкай, паколькі адрэкамендавалі сябе на ёй найважнейшыя прадпрыемствы Беларусі, у якіх поўны экспартны патэнцыял. Вельмі важным з'яўляецца тое, што рэкамендуюцца таксама фірмы ў сферы паслуг, асабліва банкавых.

Як можна было заўважыць у час выстаўкі, вялікае зацікаўленне г.зв. звычайных наведвальнікаў выклікала мэблевая, тэкстыльная і прадуктовая (асабліва ласункавая) прапановы. У першы дзень наведвальнікам спадарожнічалі прэзентацыі калектываў з Беларусі, сярод іх назіральнікі з Беласточчыны (было м.інш. кіраўніцтва БГКТ) захапляліся мінскім ансамблем „Белы птах".

Польшча з'яўляецца трэцім гандлёвым партнёрам Беларусі сярод краін ЕС і пятым з ліку ўсіх краін свету. Цяпер у Беларусі зарэгістравана каля 400 прадпрыемстваў з паём замежнага капіталу. Несумненна, таксама дзякуючы папярэднім нацыянальным выстаўкам Беларусі, беларуска-польскія абароты ў мінулым годзе датычылі дакладна 1 316 пазіцый.

04.07 — 10.07

(22.03. — 20.04.) 5-9.07. гарантаваны поспех прынясе рашучае і хуткае дзеянне. Кіруйся розумам і сваім інстынктам. Ды хтосьці схоча ўцягнуць цябе ў вір сваіх спраў; зайграе на тваім пачуцці віны ці будзе цябе шантажаваць. 4-8.07. стаўлянне ўсяго на адну карту можа цябе абанкруціць.

(21.04. — 21.05.) Можаш сустрэць асобу, з якой будзе незвычайная сувязь. Гарантаваныя поспехі ў кампаніі. Нагоды для заробку. Дома не пераборшчвай з роляй пана і ўладара.

(22.05. — 22.06.) Не дайся ўкруціцца ў брудныя гульні. Чалавечая карыслівасць будзе асабліва гадкая для цябе. Не будзеш грашыць сціпласцю, бо ўсюды зайграеш на першай скрыпцы. Старое каханне не ржавее.

(23.06. — 23.07.) З 3.07. (аж да 18.07.) можаш зрабіць штосьці непаўторнае. Пераможаш сваю нясмеласць, будзеш гаваркі, прылюдны і дасціпны. З мінулага выцягвай канструктыўныя высновы, а калі не, дык кінь роздумы.

(24.07. — 23.08.) З 7.07. будзеш імпанаваць свёй спеласцю, кампетэнтнасцю і адказнасцю. Пераканешся ў каштоўнасці сяброўства. На працы можаш стаць ахвярай зайздроснага супрацоўніка. Не абяцай нічога асаблівага па звычайным жэсце сімпатыі. Дбай аб здароўе, трымайся парад лекараў.

(24.08. — 23.09.) Можаш разлічваць на сваю інтуіцыю, якая падкажа напрамак дзеянняў і шанцы поспеху. Ды будзе хтосьці дзейнічаць табе на нервы; на драбязу не звяртай увагі. У пачуццях крайнія настроі.

(24.09. — 23.10.) 3-7.07. дамаўляйся на сустрэчы, падпісвай важныя дакументы. Хоць першыя дні надта нервовыя, поўныя пачуцця няздзейсненасці. Ды не трапляй у роспач. Сітуацыя як у калейдаскопе. 5.07., калі Венера перасунецца да ззяючых Блізнят, будзеш поўны ініцыятывы, шалёных ідэй, з якіх большасць можаш зрэалізаваць.

(24.10. — 22.11.) 5-9.07. — ідэальны момант на бравурныя дзеянні. Знакаміта табе пойдзе ў прыватных справах, рандэву будуць проста касмічныя, а блізкія захопяць цябе сваім энтузіязмам. 4-06.07. не пераконвай іншых да сваіх думак, каб не было непатрэбных спрэчак. Работа гарыць табе ў руках

(23.11. — 22.12.) Асабліва памысны перыяд — з 7.07. (да 13.07.): шчаслівыя выпадкі, добры настрой, нечаканыя здзяйсненні мараў. Але ў першыя дні не пераацэньвай сваіх магчымасцей.

(23.12. — 20.01.) З 7.07. выкажашся рашучасцю, адчаем, дысцыплінай. Мэты дасягнеш хутчэй, чымсьці думаеш. Поўня Месяца 7.07. прадвяшчае некарысныя здарэнні, страты і няздзейсненыя надзеі; разлічвай толькі на сябе самога. Пачакай з падпісваннем важных папераў.

(21.01. — 19.02.) Марс (5-9.07.) пабудзіць цябе: будзеш больш хуткі, энергічны, моцны характарам. Добра пільнуй важных дакументаў. У пачуццях проста фантастычна. Самаўпэўненасць, адвага і рашучасць — шлях да поспеху.

(20.02. — 21.03.) Спачатку — страх перад нявядомым і фінансавыя праблемы. Будзь вельмі асцярожны на пакупках. З 7.07. (да 13.07.) будзеш захоплены — невялікім высілкам дасягнеш вельмі шмат. 4-8.07. можаш пачаць змагацца за непатрэбнае для цябе; тут інтуіцыя не падкажа найлепшага.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960